Міра Лукша ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Адам Бычкоўскі ☞ 8,9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 41 (2735) Год LIII | Беласток, 12 кастрычніка 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Зубрыная печань і беларускія выбары

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Аб выбарах у Палату прадстаўнікоў беларускага парламента (28 верасня 2008 г.) пачало быць сапраўды гучна ў Польшчы ўжо 12 верасня, калі ў Віскулях у Белавежскай пушчы — як гэта назвалі — дайшло да пераломнага спаткання міністраў замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага і Беларусі Сяргея Мартынава. Міністр Сікорскі пасля гэтай сустрэчы запэўніваў журналістаў:

— Прыйшоў час прыкмеціць пазітыўныя змены ў беларускай палітыцы і на добрыя ініцыятывы адказваць добрымі ініцыятывамі.

Абвяшчаў так у аэрапорце ў Варшаве пасля вяртання з Віскулёў з больш чым паўтарагадзінным спазненнем, што тлумачыў беларускай гасціннасцю: „Беларуская самагонка ды зубрыная пячонка — цікавы досвед".

Паміж спатканнем у Віскулях і выбарамі 28 верасня „Ніва" дамаўлялася на інтэрв'ю з міністрам Сікорскім так, каб паказалася яно ў перадвыбарчы тыдзень. Згодна з гарантыяй прэс-сакратара МЗС Пятра Пашкоўскага мела да яго дайсці ў г.зв. апошнюю хвілін у. У дамоўлены дзень, у чарговы раз, пазванілі мы пану прэс-сакратару. Пачулі: „Гэта вельмі добрая ідэя, варта, каб гэтая размова паказалася. Але сустрэча можа адбыцца позна папоўдні".

З надзеяй рушылі мы чыгункай у Варшаву, каб выпадкова з-за гэтак званых часапрасторавых цяжкасцей не прапусціць такую магчымасць. Калі цягнік ужо стаяў на станцыі Варшава-Усходняя, мы яшчэ раз пазванілі прэс-сакратару Пашкоўскаму.

— У мяне для вас прыкрая вестка. Пан міністр па прычыне недахопу часу мусіў выбіраць. Рашыўся прыняць брыгаду журналістаў з Японіі.

— Дык можа пасля?.. Толькі 20 хвілін… — прасіліся мы.

— Ну, на жаль. Пасля ў пана міністра няма часу, а ў наступныя дні выязджае ён у Братыславу, Парыж і ЗША.

Арыенціровачныя пункты

Прэм'ер Дональд Туск у інтэрв'ю таднёвіку „Палітыка" (пасля выбараў) сцвердзіў, калі ў яго пыталіся, ці „гульня з Беларуссю не з'яўляецца занадта рызыкоўнай", наступнае:

— Яна рызыкоўная. Пакуль хочам здабыць столькі, колькі ўдасца, карысці для польскай меншасці і тамашняй дэмакратычнай апазіцыі і я лічу, што гэты працэс паступае вельмі памалу. Да гэгата часу польская палітыка прынесла вынікі, няма палітвязняў, рэпрэсіі там дакучлівыя, ды не жорсткія, прэзідэнт Лукашэнка, здаецца, пачаў паказваць зацікаўленне нейкім балансам паміж Расіяй і Еўропай. Гэта і ёсць той момант, у якім Польшча можа стаць суканструктарам істотных змен.

Міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі (справа) і Беларусі Сяргей Мартынаў

І далей гаварыў пра ролю Анжалікі Борыс, кіраўніка непрызнаванага рэжымам Аляксанра Лукашэнкі Саюза палякаў Беларусі, якую выклікалі (!!!) перад выбарамі ў МЗС у Варшаве:

— Для мяне аднак жа відавочна, што беларускі ўрад мусіць паказаць, перш за ўсё ў адносінах да меншасцей, як рэалізуе элементарныя дэмакратычныя стандарты. Несумненна, такім арыенціровачным пунктам мусіць быць Анжаліка Борыс, яна мусіць быць неабвержным лідарам такога працэсу, гэта яна напіша сцэнарый магчымага паразумення.

На досвітку ў паслявыбарчы панядзелак, у TVN24 журналіст Радыё Рацыя Сяргей Скулавец на літаратурнай беларускай мове каменціраваў падзеі ўчарашняга дня ў Беларусі. Вядучы праграму двойчы яму перабіваў, з націскам паўтараючы:

— Czy mógłby pan mówić po polsku, bo po rosyjsku nasi widzowie nie rozumieją.

Усё было вядомым

Яшчэ ў перадвыбарчую суботу ў Варшаве адбылася маніфестацыя пад лозунгам: „Nie uznawajcie wyborów na Białorusi!" Яе галоўнымі арганізатарамі былі Згуртаванне „Звяз у падтрымку дэмакратыі ў Беларусі" ды Ініцыятыва „Беларуская нацыянальная памяць". Перад калонай караля Зыгмунта на Замкавым пляцы — як мы палічылі — сабралася пад трыццаць чалавек. Маніфестацыя пад аховай паліцыі прайшлася па Кракаўскім прадмесці, Новым Свеце і пляцы Трох Крыжоў пад сядзібу парламента, дзе быў пададзены „заклік польскіх і беларускіх дэмакратычных арганізацый уладам Польшчы і Еўрасаюза". Пад Прэзідэнцкім палацам і, м.інш., Варшаўскім універсітам удзельнікі шэсця скандавалі: „Białoruś — tak, Łukaszenko — nie!", „Wolna Białoruś!". Перад тым, як вырушыць на шлях маніфестацыі, Антось Цялежнікаў са „Звязу ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі", які даўжэйшы час пражывае ў Польшчы, сказаў „Ніве":

— Вельмі важна, каб Захад не прызнаў вынікаў гэтых выбараў таму, што гэта не свабодныя выбары. Калі гэтыя вынікі будуць прызнаныя, дык пачнецца далейшы дыялог Лукашэнкі з Захадам і Лукашэнка будзе атрымліваць ад гэтага далейшыя карысці. Медыі далей не з'яўляюцца свабоднымі і няма свабоды сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання. Нявысветлена справа таямнічых знікненняў палітычных дзеячаў. Лукашэнка ў апошні час шмат гаворыць пра гэтыя знікненні, але мінула дзесяць гадоў і ад гэтых людзей няма следу. Лукашэнка вельмі хітры. Гэта ілгун. Еўропа хоча ведаць пра гэта як пра праўду. Не хоча бачыць правапарушэнняў у Беларусі. Тое, што выпусцілі палітвязняў, у сапраўднасці нічога не мяняе. Пасля выбараў будуць чарговыя крымінальныя справы за распаўсюджванне гэтак званай экстрэмісцкай літаратуры. Лукашэнка не змяняецца, толькі грыміруецца перад Захадам.

Пасля Антось Цялежнікаў звярнуўся да тлуму:

— Гэта будзе чарговы выбарчы фарс на Беларусі! Хочам, каб Лукашэнка правёў новыя выбары, вольныя, пад націскам Захаду, Польшчы таксама.

Маніфеставаў і пан Адольф з сям'ёй, якая прыйшла пад бел-чырвона-белым сцягам. Гэты пажылы мужчына, родам з Радзівілаўкі Мельніцкай гміны, меў завешаны на сабе транспарант, на якім можна было прачытаць: „28 września — egzamin z dojrzałości politycznej Białorusi". З „Нівай" падзяліўся ён сваімі меркаваннямі:

— У нас у Польшчы таксама пры камунізме гаварылі, што ўсё прыгожа, дакладна так, як Лукашэнка кажа пра Беларусь.

У маніфестацыі ўдзельнічаў, а пасля пад Сейм разам з іншымі яе вёў дэпутат ад Грамадзянскай платформы Міхал Шчэрба. У перадвыбарчую суботу так заклікаў ён, галоўным чынам замежных турыстаў, што прахаджваліся па Замкавым пляцы:

— Гэтая мая прысутнасць на гэтай маніфестацыі з'яўляецца нейкім знакам салідарнасці. Ужо ў гэты момант ведаем, што гэтыя выбары не будуць поўнасцю дэмакратычныя, паколькі выбарчая кампанія практычна не існавала, апазіцыя адсутнічала ў медыях, не былі зарэгістраваны ўсе кандыдаты ад апазіцыі. Беларусам неабходны павеў з Захаду, каб захліснуліся працяг ☞10

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група**: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група**: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **26 кастрычніка 2008 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў лістападзе 2008 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:

Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

9 770546 196000

Гульні скончыліся

Ну вось і скончылася беларуская нацыянальная гульня пад назвай „выбары”. Пра ўладу пісаць зусім не хочаца, бо яе асноўнае заданне, што засведчылі свае і міжнародныя незалежныя назіральнікі, цягам астатніх чатырнаццаці гадоў адно — уцягнуць у сістэму фальшавання як мага больш людзей, стварыць сістэму кругавой парукі. Тут усё зразумела, прынамсі для тых, хто чытае хоць бы адну незалежную газету хоць бы раз у год. Дадзены мой артыкул будзе досыць эмацыйным заклікам да людзей, якія прыналежаць да сістэмнай апазіцыі, хоць у існаванне такой многія ўжо не вераць.

Шаноўныя сябры! Калі вам зусім перакрывіла мазгі на мінулай кампаніі, пастарайцеся зірнуць на свет цвярозым паглядам. Паглядзіце ў чыстыя вочы сваіх малых дзяцей, ці ўнукаў! Укленчыце хоць раз у жыцці, хто даўно гэтага не рабіў, ці дагэтуль такога не рабіў ніколі, перад абразамі. Патрывожце ўрэшце сваё сумленне, якое ёсць у кожнага чалавека, незалежна ад яго палітычных поглядаў і прынцыпаў. Над краінай навісла страшэнная небяспека — пабудова атамнай станцыі, якая паводле хлуслівай прапаганды прамаскоўскай улады, што засядае ў Мінску, нібыта мусіць забяспечыць эканамічную бяспеку нашай дзяржавы.

Першае, што могуць зрабіць аб’яднаныя дэмакратычныя сілы цяпер — гэта скласці адкрыты зварот да чалавека, які сёння называе сябе прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйных мірных шляхоў змены ўлады практычна не засталося. Таму трэба паспрабаваць пайсці так званым „ліберыйскім варыянтам”. Аляксандру Лукашэнку і ягонай сям’і аб’яднаныя дэмакратычныя сілы абавязаны на гэтым этапе прапанаваць сысці ў адстаўку і гарантаваць асабістую бяспеку. І няхай з’язджае ў так любую яму Расію, ці ў Венесуэлу, ці ў які-небудзь Кітай з усімі сваімі банкаўскімі рахункамі і актывамі. Часовая ўлада пры гэтым перадаецца цяперашняму Савету Міністраў, які павінен прызначыць новыя выбары (тут могуць быць варыянты — ці то выбары прэзідэнта, ці то новага парламента). Гарантам працэсу мусяць выступіць заходнія дзяржавы і міжнародныя структуры, праз якія будзе забяспечаны фармат прапаноў. Безумоўна, гэта варыянт ідылічны. І напэўна непрымальны не толькі для Аляксандра Лукашэнкі, але нават на стадыі абмеркавання для многіх тых, хто зазнаў жорсткія рэпрэсіі цягам апошняга перыяду і нават страціў блізкіх людзей. Але трэба пастарацца глянуць на сітуацыю з пункту гледжання ратавання ўсёй нацыі. Так, зло мусіць быць пакарана, але яно найперш у чалавечых душах — то ці варта яго так персаніфікаваць і тым больш атаясамляць з адным, насамрэч абсалютна няшчасным чалавекам, які кіраваў і кіруе такой заганнай дзяржаўнай сістэмай, стаўшы сам яе закладнікам і зрабіўшы закладнікамі 9 мільёнаў людзей.

Аўтар не ёсць безнадзейным утапістам і цудоўна разумее, што варыянт добраахвотнай адстаўкі мае шанцы не большыя чым адзін з дзесяці тысяч. Але такі палітычны жэст цвёрдай і добрай волі мусіць быць зроблены апазіцыяй. Наступнае заданне — давесці гэтую інфармацыю да як мага большай колькасці грамадзян. Зрабіць гэта будзе не складана ў сілу прынцыпова новай паставы апазіцыі, якая разляціцца хуткай інфармацыйнай навіной па ўсёй краіне.

Далейшую працу з насельніцтвам у міжвыбарчы перыяд апазіцыя мусіць грунтаваць на цвёрдай пазіцыі змагання супраць будовы атамнай станцыі. Відавочна, што пабудову гэтай станцыі будзе ажыццяўляць Расія і толькі Расія, усе гульні ў розныя міжнародныя „тэндэры” — гэта чысцейшай вады падман і хлуслівыя манеўры. Зразумела таксама, што месца для гэтай будовы даўно выбрана — гэта Астравецкая пляцоўка. Такім чынам, будзе забруджвацца апошняя больш-менш экалагічна чыстая частка Беларусі — яе паўночная частка, якая была найбольш перспектыўная для развіцця турызму. Зрэшты няважна, дзе будзе будавацца станцыя. Важна, што яе будаванне — гэта вяртанне на Беларусь расійскай ядзернай зброі. Важна, што яе будаванне — гэта поўная залежнасць ад крамлёўскай палітычнай банды. Бо новая атамная станцыя на тэрыторыі нашай краіны — гэта не эканамічны, а найперш вайсковы і геапалітычны праект.

Гульні ў розныя выбары скончыліся!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Узыходзячы Беласток

Вось знак найфайнейшага горада — у цэнтры ягоны кшталт (нагадваючы першую Рэч Паспалітую!), наўкол сонечнае праменне хвалы, завершанае пунктам клічніка. Паўгода кракаўская рэкламная фірма „Эскадра” абмяркоўвала і дапрацоўвала гэты знак, які мае быць сутнасцю Беластока, горада, дзе хочаца і варта жыць.

Ад 1 кастрычніка Беласток мае асацыявацца з гэтым знакам, які, як кажа Матэвуш Змысьлёны, крэатыўны дырэктар піярнай групы, вельмі ім удаўся (штомесячнік „Прэсс” таксама прылічыў яго да 10 найлепшых знакаў у Польшчы). Беластоцкае сонейка — найлепшае ва ўсёй краіне! Цяпер яно паявіцца і на важных, і больш прыватных, свойскіх рэчах. Рушыла таксама прамацыйная кампанія, якой відным знакам з’яўляюцца свойскія зоркі. Абутыя ў спартыўныя „трампачкі”, аздобленыя ў золата-амарантавыя пасачкі. Ніякія не „цэлебрыты”, а звычайныя жыхары Беластока. Габрыель Пятроўскі — танцор, Марыюш Гогаль — футбаліст маладой „Ягелоніі”, наймалодшы дэбютант у экстра-класе, Марцін Майсюшка — малады лекар, навуковец, лаўрэат узнагароды „Палітыкі”, які выбраў кар’еру ў краіне, Іаланта Шчыгел-Рагоўская — вядомая з публікацый пра гісторыю Беластока, Славамір Майсюшка — архітэктар, журналіст і аніматар культуры, Марыя Дзенгялеўская — флейтыстка. Адным словам — Актыўныя Грамадзяне. Трымаюць яны ў руках знак тыпу „Я — лагатып — Беласток”. А на асобных банерах кажуць яны пра тое, што ў іх на сэрцы: „Мая мара? Зайграць з Барселонай на новым стадыёне!” — гэта Марыюш. Славамір паказвае на візуалізацыю змен, якія несумненна наступілі пры новай уладзе і голы цэнтр Беластока: „Тут узнікне рынак”. Але прыдаўся б сярод іх, нашых звычайных зорак, нейкі хоць адзін спелы беластачанін, нейкі жвавы пенсіянер, — заўважылі гледачы на прэс-канферэнцыі. І мо яшчэ адна асоба са шматкультурнага горада, якога тою шматкультурнасцю так ганарыцца магістрат?!

— Беласток варты таго, каб мець добрую марку, а найлепшымі пасламі з’яўляюцца задаволеныя ягоныя жыхары, — прызнаўся прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі. — Мы ўсе пад пазітыўным уражаннем вынікаў працы „Эскадры”. Уся кампанія асацыюецца з надзеяй на лепшае заўтра!

„Узыходзячы Беласток” — гэта лагатып і „цэлая сістэма візуальнай тоеснасці”. Рэкламныя героі прызнаюцца, што не мелі праблем з ідэнтыфікацыяй. „Добры дзень! Тут Беласток! Без сумнення гэта будзе добры дзень!” — пачынаюцца ранішнія прывітанні па радыё. Рэкламы ў горадзе, інтэрнэце, рэкламныя споты маюць яднаць жыхароў вакол ідэі, што жывуць яны ў горадзе іх сэрца, прыязным і такім, якім трэба ганарыцца і хваліцца. Як сказаў танцор, адзін з лепшых удзельнікаў конкурсаў „You Can Dance” (у якіх бліснулі беластачане): найбольшая моц — у людзях. А пачнецца ўсё добрай забавай на галюткім гарадскім пляцы ў цэнтры, ужо ў 6 гадзін раніцы, а завершыцца адкрыццём Алеі Блюза (што паміж барам „Падляшша” і піўной „Паляна”). Жыхары могуць урэшце намаляваца ўдосталь у вертыкалі і гарызанталі — на вуліцах і сценах, прыняць сур’ёзны ўдзел у пленэры галерэі „Арсенал”, пабачыць вуліцу без рэклам, натанцавацца... Марай з’яўляецца заснаванне Фан-клуба Беластока: „такая грамадская заяўка на сабранне людзей думаючых пазітыўна аб горадзе!” — перакананы кракавянін Матэвуш Змысьлёны. Вельмі рады ён супрацоўніцтву з беластоцкім магістратам, прыняў пад увагу ўсе ягоныя прапановы ці мо ўнушэнні. Чалавек збоку, з адкрытага Кракава, прыняў усё за чыстую манету. Мабыць, і не падумаў, не прыйшло яму ў галаву (таму і не пытаўся), што чынушы з Узыходзячага Беластока надзелі на свае шаноўныя галовы спецыяльныя акуляры ці можа конскія кляпкі і адно балбочуць пра свой гонар ад шматкультурнасці, а яе і не бачаць, і бачыць не хочуць і, мабыць, не ўбачаць. Можа, не ведаюць? Папыталіся б, пракансультавалі б, прынамсі для выгляду... А, можа, не ўмеюць?! Ды калі nie potrafisz — nie pchaj się na afisz! Перавярнуць стары брук, павыдзіраць старыя дрэвы з каранямі, перасунуць помнік на другі бок вуліцы, папячатаць Беласток файнымі значкамі — невялікае мастацтва. Вось тут патрэбны той новы світанак свядомасці!

Міра ЛУКША

Вачыма еўрапейца

Справы ідуць іначай

З вялікай пампезнасцю ў Варшаве адзначалася 25 гадавіна атрымання былым прэзідэнтам РП Нобелеўскай прэміі міру. Сярод гасцей на Каралеўскім замку быў Станіслаў Шушкевіч, старшыня поўнасцю дэмакратычна выбранага Вярхоўнага Савета XIII склікання (1991-1994), які быў адным з падпісантаў у снежні 1991 г. у Віскулях пагаднення аб роспуску СССР (там, дзе ў апошні час дайшло да быццам бы пераломнай сустрэчы міністра замежных спраў Радаслава Сікорскага з яго беларускім калегам Сяргеем Мартынавым). Пры нагодзе яго выступлення прыгадалася мне, што ён — прафесар фізічных навук, падобна як канцлер Нямеччыны Ангела Меркель, якую ў апошні час ушанавалі дактаратам honoris causa Вроцлаўскай палітэхнікі, хоць, без сумнення, заслугі ў галіне даследаванняў па фізіцы ў Станіслава Шушкевіча большыя чым у канцлер Меркель (хоць бы па прычыне апрацавання больш за сямідзесяці вынаходстваў).

На Каралеўскім замку Станіслаў Шушкевіч дзякаваў прэзідэнту Валэнсу за дзеянні ў карысць свабоднай Беларусі і, спасылаючыся на паслявыбарчую сітуацыю ў сваёй краіне, гаварыў:

— Спадзяюся, што ў Беларусі будзе свой Лех Валэнса. Заслугай Леха Валэнсы з’яўляецца тое, што адшукаў ён беспамылковы шлях да свабоды.

Адкуль памятаю, адзінаму польскаму лаўрэату Нобелеўскай прэміі міру Беларусь не была абыякавай. У размове з „Нівай” летам мінулага года, калі я распытаў яго, ці ён, як лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру, можа што-небудзь зрабіць, каб падтрымаць беларускую дэмакратыю, адказаў м.інш.:

— Мае наступнікі пайшлі далей, чым я сабе ўяўляў. Тое, што наступіла пасля ва ўсходняй польскай замежнай палітыцы, ніяк не супадала з маёй канцэпцыяй. Мела быць, у гэтых нашых імкненнях: роўнасць, салідарнасць, ніхто нікога не меў падстаўляць. Пасля завяршэння майго прэзідэнцтва я не хацеў аб гэтым крычаць, каб свет не сказаў, што Польшча сілай стараецца Беларусь ці Украіну цягнуць да дэмакратыі, сама „заводзіць” дэмакратыю. Сёння якраз толькі стараюся, прабую, але ўсё, што вакол адбываецца, гэта не тая рэальнасць, якую я сабе ўяўляў.

У час кароткага брыфінгу на Каралеўскім замку (дзень пасля завяршэння парламенцкіх выбараў у Беларусі) Лех Валэнса тлумачыў, звяртаючыся — як можна было зразумець — да беларускіх дэмакратычных сіл:

— Сёння Еўропа кансалідуецца. Праз дзесяць гадоў будзе мець яна сілу вам [Беларусі — М. Х.] дапамагчы. Рабіце ўсё асцярожна, бо калі абразіце Расію, то пакінуць вас на каленях і будзеце прымушаны прасіць у яе прабачэння. Завінцяць вам на зіму газ і электраток, а мы вам не зможам гэтага даць, бо гэтага ў нас саміх няма. Таму асцярожна, вытрымайце будуючы, праграмна пару гадоў, а свабода і так да вас прыйдзе. Падрыхтуйцеся да яе лепш чым мы, бо ў нас не было праграмы. Можаце браць высновы з нашых памылак.

Пры нагодзе выступлення Станіслава Шушкевіча і заяў Леха Валэнсы прыгадаў я сабе, што лідар першай „Салідарнасці” ўжо даўно падаў заяву на назначэнне Нобелеўскай прэміі міру якраз былому старшыні дэмакратычнага Вярхоўнага Савета. Адно штосьці Еўропа, свет неяк не спяшаюцца з такім жэстам. Пасля выбараў у Палату прадстаўнікоў Беларусі ўжо відаць, што Нобелеўскі камітэт не схоча раздражняць Аляксандра Лукашэнку, каб не было так як у 1983 г., калі тагачасная польская ўлада раз’юшылася пасля ўшанавання Нобелеўскай прэміяй Леха Валэнсы.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Да 50-годдзя з дня нараджэння

Міра Лукша і дзікі птах верабей

З паэткай, празаікам, журналісткай Мірай ЛУКШАЙ сустрэліся мы ў Семяноўцы, у месцы, дзе калісь знаходзілася пачатковая школа, у якой вучылася наша гераіня. Паколькі стаяла цёплае надвор'е, мы, прыстойная кампанія: настаўнікі і журналісты, запрасілі паэтку ў пленэр і заселі ў цяні старой ліпы, на былой школьнай пляцоўцы. Навокал, у роўных пакосах, пахнела скошаная трава. Гэтая дэталь істотная, бо яна спрацавала тут як медыум. Карацей, адзін з нашых сяброў маніякальна напяваў першы радок старой песні: Ой чыя то ніва, чые то пакосы? Як высветлілася ў час гутаркі, школьная ніва і пакосы раней належалі самай метафізічнай жанчыне ў навакольлі, дарэчы, сваячцы нашай гераіні. Але, пра гэта распавядзе нам сама Міра Лукша...

— Сёння Вы спалі ў сваёй школьнай бібліятэцы. Ці Вам нешта прыснілася?

— Я спецыяльна выбрала пакой 103, таму што ў мяне ёсць з гэтай залкай пазітыўныя асацыяцыі. Калі я была вучаніцай гэтай школы, я прачытала, здаецца, усе кніжкі з нашай бібліятэкі. Сёння я спала разам з матушкай Людмілай, мы доўга размаўлялі пра розныя справы, а пасля я заснула каменным сном...

— А ці хоць раз прыснілася Вам як пішаце?

— Здаецца, у сне я *напісала* рэцэнзію Славаміру Адамовічу. Сапраўды, сніцца так, быццам ты пісаў у сапраўднасці. Складваецца ідэальны тэкст, раніцай падымаешся — няма тэксту, трэба пісаць ад нова. А таго ўжо не паўторыш...

Часта ўначы я пішу тэксты ў „Ніву"; раптам мозг перастаўляецца на значна вышэйшы ўзровень, я кідаю тэкст і пішу верш. Так, напрыклад, я злавіла „Зайца з Заячкаў" ці „Рагача з Рагачоў". Калі пішацца такі верш, складваецца ўражанне, што ён ужо існуе. Ты толькі ловіш тую мелодыю, той рытм, які б'е як тваё сэрца. Тады ўзнікаюць лепшыя вершы, людзі іх памятаюць, паўтараюць.

Ці вершы мяне будзяць? Былі ў мяне такія творчыя моманты, калі я пісала цыкл „Вершы тутэйшыя". І, самае цікавае, яны ўзніклі больш-менш у адзін час ночы.

— Ваш паэтычны дэбют адбыўся дзесьці тут, побач школы і царквы...

— Вось, калі сюды прыязджаў мітрапаліт Васілій, настаўнікі прымусілі мяне напісаць па-беларуску вершык і прачытаць яго госцю. Я не любіла выступаць публічна, і скажу яшчэ, што мяне моцна нервавала, калі гаварылі пра мяне: „Міркапаэтка"! Здаецца, мой верш спадабаўся мітрапаліту, ён пацалаваў мяне ў галоўку. Я тады не ведала, што ён беларускі патрыёт і любіць беларускую паэзію.

— У якім Вы тады былі класе?

— Не памятаю, у пятым або шостым.

— З „Нівай" Вы супрацоўнічаеце ўжо 35 гадоў, з 1973 года. Ці памятаеце свой першы верш у друку?

— Мне не было яшчэ пятнаццаці гадоў. Той вершык Георгій Валкавыцкі надрукаваў у „Парнасіку". Пра што ён быў? Пра тое, што знаходзіцца на гарышчы ў нашай хаце. Там былі пучкі цыбулі, кумпяк, пах воўны, пах старых кніжак...

— Дванаццаць гадоў пазней Вы сталі журналісткай „Нівы".

— У „Ніве" я з 1985 года. І ўжо зляцела тут палова майго жыцця. Мая работа — радасць. Я лічу, што кожны, хто піша ў „Ніву", дакладвае свой залаты каменьчык. Апошнім часам я рабіла пошукі людзей, які раней пісалі ў нашу газету, якія былі пачынальнікамі, грунтавалі для нас падмурак. Яны гэта рабілі шчыра і я цаню іх, нават калі нехта мае іншыя палітычныя погляды чым я.

— Вы лічыце сябе перш за ўсё журналісткай, паэткай, жанчынай, маці?

— Лічу сябе маці і жанчынай, якой амаль пяцьдзесят гадоў; майму сыну Радаславу — 14. Часам ён звяртаецца да мяне: МАТКО! Калі пішу вершы, адчуваю сябе паэткай, калі пішу вершы для дзяцей — адчуваю сябе дзіцём...

— Калі зірнуць на „Ніву" і наш літаратурны рух, пакажацца, што амаль усе аўтары нарадзіліся ў навакольлі Белавежскай пушчы. Ці Вы, як пушчанская паэтка, адчуваеце феномен месца?

— На гэтай тэрыторыі сапраўды многа народных паэтаў, у тым сэнсе, што людзям падабаецца рыфмаванае слова. Многія памятаюць вершы, часам іх уплятаюць у размову, у быль, у жарт. Настрой у тутэйшых людзей лірычны, не толькі адно каб корпаліся ў глебе.

— У Вашай сям'і вершы пішуць тры пакаленні жанчын?

— Мая мама піша вершы і апавяданні, яна прымала ўдзел у літаратурных конкурсах і яе заўважылі. Таксама піша Мартына, дачка маёй сястры Аліны (і яна піша няблага), яна цяпер студэнтка ветэрынарыі. Сапраўды, у нас тры пакаленні: бабуля, дочкі, унучка...

— Вернемся зноў да сноў. Ці ў Беластоку Вам сніцца лес?

— Часта мне сніцца вось гэтая дарога *(Міра Лукша паказвае нам дарогу, што ідзе ад семяноўскай царквы ў бок Баб'яй Гары)*. Калісь мне прыснілася, што я лячу па гэтай дарозе, пасля я ляцела ў нейкай дзіўнай каляснiцы. Асабліва, калі пішу для дзяцей, тады мне лёгка. А кажуць, дарослыя людзі, калі маюць сваю вагу, не лятаюць!

— Па дарозе, якая Вам сніцца (ад Семяноўкі ў Баб'ю Гару) стаяць крыжы, дзе, паводле мясцовых людзей, дзеюцца дзіўныя рэчы, там страшыць і можна страціць арыентацыю. У Вашай творчасці таксама адчуваецца стыхія магіі, нават наша размова быццам мэтанакіравана траціць арыентацыю?

— Бо зараз мы сядзім і гутарым на зямлі самай метафізічнай жанчыны не толькі ў навакольлі. Яна ў фільме Тамары Саланевіч іграла славутую чарадзейку. Яе не трэба было надта спецыяльна грыміраваць! Мы, дарэчы, з Верай Лявіцкай сям'я — гэта малодшая сястра майго дзедкі Івана Кастанчука. Ёй 95 гадоў і яна жыве ў Ліпску ва ўнучкі Валі Панасэвіч. Вось, бачыце, і такія жанчыны ёсць у маёй сям'і.

— Значыць, „ніва і пакосы" — Вашыя?

— Нашыя! У свой час бабуля Вера аддала дарам поле для патрэб праваслаўнай парафіі і школы. Пасля тут зрабілі спартыўную пляцоўку.

— Мы ведаем, што жанчыны з Вашых бакоў маюць асаблівую моц. Іх усе кахаюць і адначасова вельмі ж баяцца. Вы таксама зачаравалі і паддалі ў сваю службу вялікіх паэтаў. Скажыце шчыра, а ці Вас нехта таксама зачараваў?

— Напэўна захапіў мяне Георгій Валкавыцкі. І зараз, калі ён старэйшы, мая сіла захаплення і пачуцця моцы ад яго яшчэ большая. Ну, напэўна захапілі мяне Мікола Гайдук, Сакрат Яновіч. Сакрат спачатку мяне моцна дзёўб за маўленне. А вядома, калі чалавека папракаеш, трапляецца яму яшчэ больш памылак. Я не люблю калі мяне хваляць — гэта крыху падазроная справа. Але мне было сорамна пісаць абы-як, сядзець склаўшы рукі. Хто мяне „зачараваў"?.. Настаўніца ў нашай пачатковай школе, наша пані Марыся Буйко (Вілюк), родам з Палічнай. Яна ў кожным з нас, вучняў, знайшла штосьці цікавае, адкрывала і дапамагала развіваць здольнасці. Аднойчы яна сказала маёй маме, што баіцца за мяне...

— Мы пыталіся ў Вас пра пажар сэрца.

— У апошні час?

— Так.

— Я не ведаю што адказаць. У апошні час мяне захапіў чалавек, які старэйшы на год за маю маму. Ён такі статны, прыгожая ў яго душа. Здаецца, у маім захапленні ёсць нават прыкметы закахання. Ды ён — далёка...

— Мы пра пажар — Вы пра прыкметы закахання?!

— Сапраўды, я, так сказаць, настроеная любоўю. Думаю, што вялікі ўплыў мела на мяне паэзія. Сапраўды, бывала, чалавек ледзь не згарэў. Што вам сказаць пра Толіка Сыса? Я кахала Толіка, але гэта былі ўзрывы, хутчэй каханне за Беларусь. Ён бараніў мяне. А я заўсёды хацела закахацца ў нейкага файнага беларуса...

— Значыць, Ваш тып: паэты, інтэлектуалы, прыгожыя сеніёры?

— Не, гэта не так. Здараецца, што я захапляюся нейкім... заморкам. І што дзеецца? Гэты непрыкметны хлапец, раптам... расцвітае. Ён мае небывалы поспех, зараз нейкую дзеўку знойдзе, раптам усе яго бачаць, хочуць. Таму каля мяне заўсёды круцяцца нейкія крыху жыццёвыя неўдалоты і падазроныя тыпы... А мае любові і спрыяння хапае на ўвесь свет!

— Мы, менавіта, хацелі спытацца ў Вас пра эксперыменты з тоеснасцю і полам. Вы часам хаваецеся пад мужчынскімі псеўдананімамі, згадаць бы тут Вандала Арлянскага. Гэты персанаж з барадой...

— Бо Вандал Арлянскі — чысты сатырык! Калі гаворка пра гульню з тоеснасцю... У дзяцінстве ў мяне былі праблемы з псіхічнай арыентацыяй. Мае бацькі, як большасць людзей з вёскі, хацелі, каб я, першае іхняе дзіцё, нарадзілася хлопцам. Таму я іграла ў футбол, лазіла па платах, білася да крыві і барукалася з хлопцамі. Хоць была танклявая і далікатнае мела здароўе. Раз нават завяла хлопцаў за мяжу, аж у Беларусь. Проста дзейнічала іх праграма, бацькі, дарэчы, не сказалі мне, каб я была звычайнай дзяўчынкай.

— Яшчэ адно пытанне з краіны сноў. Які сон здаецца Вам быць прадказальным?

— Прыснілася мне, што я ў вёсцы Медзвядзі, тут непадалёк Семяноўкі. Я прахаджваюся сярод шпалераў вінаградніку і бачу гняздзечка. У ім дзесьці дваццаць перапёлчыных птушанят. Яны пакінутыя, без маткі. Я кінулася ратаваць іх, загарнула ў кашулю, прытуліла і панесла ў бяспечнае месца... Гэтак шукаеш і ратуеш маленькае, цёплае, кінутае слова.

— У дзіцячым цыкле пра звяроў, які пішаце для „Зоркі", сапраўды ёсць Мядзведзь з Медзвядзёў, аднак найбольш вершаў — пра птушак. Колькі іх Вы ўжо выпусцілі ў літаратурнае неба?

— Адзінаццаць ужо птушачак...

— Наогул паэты — эгаісты, часта яны натхняюцца сваімі вершамі. Як гэта выглядае ў Вашым выпадку?

— Мяне часта натхняе літаратура іншых пісьменнікаў. Эмоцыі іншых людзей. Прырода. Свой куток, калі, напрыклад, як тут, у маім навакольлі, чалавек адчувае сябе поўна, бяспечна. Калі ты ідзеш і людзі ведаюць, што гэта ідзеш ты.

— Тады жадаем Вам, на парозе залатога юбілею, сілы і натхнення. І каб выратаваныя Вамі птушкі спявалі ў сне, творчасці і жыцці...

— Хай пяюць яны нам усім!

Гутарылі: Ганна КАНДРАЦЮК і Ігар ЛУКАШУК. Супрацоўніцтва: **Людміла Грыгарук, Бэата Кендысь, Янка Карчэўскі, Валя Бабулевіч, Аліна Ваўранюк, Іаланта Грыгарук, Яўген Вапа, Ілона Карпюк, Марыся Тамчук, Івона Баршчэўская.** Першапачатковая версія інтэрв'ю ўзнікла на 22 Сустрэчах „Зоркі" ў Семяноўцы ў пачатку чэрвеня г.г.

Усё даражэе...

Пенсіянеру кожны грош цэніцца. Я, напрыклад, лякарствы купляю ў аптэцы „Aqua” ў Кляшчэлях і ад кожных выдадзеных 30 зл. атрымоўваю купон. Кліенту за пяць купонаў давалі падарунак, затым прымаў ён удзел у латарэі. Дагэтуль я атрымаў некалькі падарункаў з аптэкі, а аднаму чарамшаніну пашанцавала выйграць пыласос. Ад мінулага года перамяніліся правілы ў аптэцы і, каб атрымаць падарунак, патрабуецца не пяць, а ўжо дзесяць купонаў па 30 зл. Узнагарода такога ж як і раней віду „падаражала” ўдвая. Нічога не скажаш. Такія правілы вольнага рынку.

Але не ў падарунках праблема. Як грыбы пасля дажджу растуць цэны харчовых прадуктаў, электраэнергіі і газу. Раней у чаромхаўскім „Аргелане” за паўкілёвы бохан хлеба я плаціў 0,99 зл., а зараз трэба заплаціць 1,46 зл. Тычыцца гэта большасці збожжавых прадуктаў ды іншага віду тавараў. Падаражалі яны на 20-30 працэнтаў. Адно цукар застаецца на месцы, бо салодкім менш карыстаемся. Аб мясных вырабах не ўспамінаю, бо ў кожнай краме іншыя цэны. Павышаюцца цэны паслуг у сельскай гаспадарцы і даражэе паліва. Калісьці хлопцы са Шлёнска прывозілі вугаль па 380-400 зл. за тону, а зараз прыходзіцца заплаціць на 100 зл. больш, хоць такая цана іх не задавальняе і гэтыя неахвотна ў Чаромху сталі прыязджаць (надта далёкая адлегласць і паліва дарагое).

Пры закупцы ў супермаркетах, а нават у вясковых крамах, сталі прыпісваць да рахунку вартасць упакоўкі — 10 грошаў. Нічога няма дарэмнага ў рыначнай эканоміцы. Неўзабаве скажуць і за паветра плаціць, бо ім таксама карыстаемся. А зарплаты застаюцца даўнейшыя. Праўда, пенсіянеру ў сакавіку прыбавілі некалькі злотых, але па гэтай прыбаўцы і след прастыў. Зараз пачаўся пратэст працаўнікоў Феміды. Гэтыя дапамінаюцца параўнання іхніх зарплат з калегамі з еўрасаюзных дзяржаў, пакуль прынамсі на тысячу злотых у месяц. Пра звычайных чорнарабочых і пенсіянераў не ўспамінаецца. Нездарма ў народзе кажуць, што не ўсім на ўсё дазваляецца. Гэтыя словы пакідаю без каментарыя.

Уладзімір СІДАРУК

Нараўка

Запрашэнне на выстаўку

З 10 кастрычніка г.г. (пятніца) войт і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы (Гайнаўскі павет) запрашаюць на пластычную выстаўку „Семяноўка-2008” у галерэі Тамары Саланевіч у Нараўцы. На шматлікіх карцінах падляшскіх мастакоў можна будзе пабачыць м.інш. пейзажы прыпушчанскай Семяноўшчыны. Працы ўзніклі ў час сёлетняга пленэру ў Семяноўцы (жывапісцы мелі прыстанішча ў Асяродку экалагічнай адукацыі). Пачатак вернісажу ў 18 гадзін.

(яц)

Ахоўваць людзей і пушчу

Аляксей МАРОЗ

http://www.straz.bialystok.pl

Калі гутарка аб ахове Белавежскай пушчы ў цэлым, то павінна яна адбывацца паралельна з дыскусіяй аб дапамозе людзям, пражываючым у пушчы і наваколлі ды забеспячэнні іх правоў на годнае жыццё, згоднае з натурай. Была б гэта падзяка для мясцовага насельніцтва, якое ад вякоў зберагала Белавежскую пушчу. Калі б не было драпежніцкай палітыкі нямецкіх акупантаў, непрадуманых і шкодных рашэнняў польскага ўрада ў міжваенны перыяд і каб больш ашчадна і прадумана вялася высечка пушчанскіх дрэў пры народнай уладзе, дык зараз намнога больш захавалася б старадаўняга дрэвастою і без асаблівых забарон мясцовае насельніцтва магло б карыстацца суседнім лесам. Якраз да гэтых дзеянняў з мінулага падыходзіць прымаўка „вінаватыя паны, а церпяць гаспадары”. Зараз мясцовае насельніцтва штораз больш насцярожана глядзіць на новыя ўказанні і забароны, датычныя распаложанага непадалёк ад іх сяліб лесу. Выдатная большасць пушчанскіх людзей выказваецца супраць павелічэння нацыянальнага парку на ўсю тэрыторыю Белавежскай пушчы. Жыхары Нараўчанскай гміны звяртаюць увагу на пагрозы для іх саміх, пушчанскай флоры і фаўне, якія можна абмежаваць або і ліквідаваць без пашырэння нацыянальнага парку.

Цыстэрны толькі ноччу

Калі масмедыі, а за імі і экалагічныя арганізацыі паднялі шум у справе будовы нафтабазы побач вёскі Лясная, насельніцтва Нараўчанскай гміны гаварыла таксама пра небяспеку для людзей і лесу ад чыгуначнага транспарту хлору, аміяку і іншых рэчываў. На тэрыторыі Польшчы цыстэрны з хімікатамі праязджаюць з Цісоўкі якраз праз Семяноўскі заліў, Белавежскую пушчу, у гэтым ліку праз Нараўчанскую гміну, Гайнаўку і едуць у напрамку Седльцаў. Па гэтым шляху таксама ездзяць тыя цягнікі з небяспечнымі матэрыяламі, якія раней ездзілі праз Беласток. Калі ў Беластоку цыстэрна з хлорам сышла з рэек, то пасля пратэстаў эколагаў і жыхароў горада небяспечны транспарт перакінулі ў найлепш захаваны старадаўні лес Еўропы і еўрапейскія лёгкія, як называюць пушчу прыхільнікі яе строгай аховы.

— Цягнікі з цыстэрнамі хлору, аміяку і іншых небяспечных рэчываў прыязджаюць днём са Свіслачы, праз апусцелую Цісоўку, у Семяноўку. Праз сам заліў едуць з хуткасцю недзе пяць кіламетраў у гадзіну. Каля Семяноўкі цыстэрны стаяць найдаўжэй, бо трэба памяняць у іх колы для далейшага падарожжа па вузейшых польскіх рэйках. Цыстэрны з небяспечнай сыравінай стаяць побач Семяноўкі ажно да ночы, бо іх транспарт адбываецца толькі ноччу. Хутчэй за ўсё няма дазволу, каб небяспечныя матэрыялы вазіць днём. Цягнікі з хлорам і аміякам едуць праз Гайнаўку ў розныя гарады Польшчы, — расказвае гайнаўскі мастак Віктар Кабац, які летам на дачы побач Семяноўскага вадасховішча назірае за жыццём прыроды і сочыць за праблемамі мясцовых людзей. — Беласток пратэставаў і астаўся без цыстэрнаў з небяспечнай сыравінай. А нашы людзі — спакойныя, няма каму пратэставаць ні ў Семяноўцы, ні ў Гайнаўцы супраць перавозу праз нашу тэрыторыю хлору ці аміяку. Хіба, што прыехалі б эколагі з Польшчы і сталі б пратэставаць, як у справе Распуды, то можа спынілі б транспарт небяспечных матэрыялаў праз Белавежскую пушчу.

Экалагічныя арганізацыі сапраўды маглі б выступіць супраць небяспечнага транспарту па тэрыторыі Гайнаўшчыны. Аварыя цыстэрны з хлорам гэта смяротная пагроза для людзей ды ўсёй флоры і фаўны Белавежскай пушчы.

Справа чыгуначнага транспарту небяспечнай сыравіны праз пушчу і горад абмяркоўвалася на сесіі Рады горада Гайнаўкі папярэдняга склікання, але гарадскія радныя дайшлі да вываду, што самі не справяцца са зменай шляхоў транспарту хлору або аміяку.

— Справа транспарту хлору праз Белавежскую пушчу паяўлялася таксама і ў час размоў войтаў і бурмістраў Гайнаўшчыны, але мы не ў змозе паўплываць на польскую чыгунку, каб тая памяняла шляхі транспарту небяспечных для жыцця ўсялякіх істот рэчываў, — сказаў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

У час згаданай гарадской сесіі прадстаўнік пажарнай аховы патлумачыў, што калі б аварыя цыстэрны з хлорам адбылася ноччу, калі людзі спяць, магло б загінуць больш людзей, чым калі б гэта адбылося днём, калі людзей можна хутчэй паведаміць аб небяспецы. Хлор разыходзіцца над зямлёй і таму ў першую чаргу пагражаў бы пражываючым на першых паверхах жылых дамоў.

У агульнапольскіх СМІ ніколі не было вялікага шуму ў справе транспарту хлору праз Белавежскую пушчу, а прынамсі так вялікага, як у выпадку прадбачванай будовы канцэрнам „Лукойл” оптавай паліўнай базы побач сяла Лясная.

— Чыгунка не інфармуе гмінных улад ні аб велічыні транспарту хлору або аміяку праз пушчу, ні аб яго часе. Ведае аб гэтым толькі пажарная ахова, якая ў выпадку аварыі павінна ліквідаваць яе паслядоўнасці, — кажа нараўчанскі войт Мікалай Павільч. — З-за гэтага транспарту наш бюджэт не папаўняецца ніякімі сродкамі, а небяспека намнога большая, чым у выпадку планаванай будовы нафтабазы побач Лясной, у якой людзі атрымалі б работу, а наш бюджэт — грашовую падтрымку.

Што яшчэ пагражае жыхарам і пушчы?

У Нараўчанскай гміне ўжо існуюць оптавыя базы паліва і газу, склады і перагрузачныя пляцоўкі мінеральных угнаенняў, шчэбню ці цэменту, якія ў меншай або большай ступені таксама пагражаюць натуральнаму асяроддзю.

— Група эколагаў з Беластока крыва глядзіць на тое, што дзеецца у Нараўчанскай гміне. Пагрозы для незахавання ў натуральным выглядзе акружаючага асяроддзя бачны ўжо ў Плянце, каля Скупава і побач самой Семяноўкі, — кажа Віктар Кабац.

Аб пратэстах эколагаў войт Нараўчанскай гміны нічога не ведае.

— Я не чуў, каб эколагі пратэставалі супраць дзейнасці ўжо існуючых у нашай гміне прадпрыемстваў, — заяўляе войт Мікалай Павільч.

Аднак адзін з маіх суразмоўцаў паінфармаваў, што дрэвы пры дарозе з Міклашэва ў напрамку Плянты пачалі засыхаць хутчэй за ўсё ад адмоўнага ўздзеяння на іх мінеральных угнаенняў.

— Раней дарога з Міклашэва ў напрамку Плянты і кусты пры ёй былі моцна абсыпаныя пылам ад мінеральных угнаенняў, якія вазілі на машынах, часам нават без прыкрыцця. Кусты былі сівенькімі ад пылу, а жанчынам прыходзілася штодзень мыць вокны, каб іх дачысціцца, — гаворыць Таіса Драўноўская з Міклашэва. — Пасля гэтая дарога была ўбітая мінеральнымі ўгнаеннямі, якія высыпаліся ў час транспарту.

(даканчэнне ў чарговым нумары)

Памяці Лукі Дзекуць-Малея, які нарадзіўся 1 кастрычніка 1888 г. у Слоніме

„Хоць памёр, жыць будзе”

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Колькі разоў праязджаю праз цэнтр Гданьска, заўсёды кідаецца мне ў вочы ўказальнік з вуліцай Лукі Дзекуця-Малея. Аднойчы нехта для жарту павярнуў яго ў напрамку вуліцы ген. Дамброўскага, большай і важнейшай, якая названая, здаецца, пасля II сусветнай вайны. Пры гэтай вуліцы менавіта і знайшоў у пасляваенны час прытулак баптысцкі прэсвітар Лука Дзекуць-Малей са сваімі братамі і сёстрамі ў веры. Сумеў ён згуртаваць іх вакол сябе і заснаваць царкву хрысціян-баптыстаў. Арганізацыйныя здольнасці былі ў яго здаўна. Шкада, што абставіны так склаліся, што мог іх праяўляць на рэлігійнай, а не на нацыянальнай ніве. Інтэграваць беларусаў яму строга забаранялася з 1919 г., калі раптам Гродна апынулася пад польскай уладай. Ён, як беларускі настаўнік, вымушаны быў адтуль з'ехаць у Брэст, праўдападобна з агаворкай, што не будзе займацца беларускай дзейнасцю. Брэст — не цэнтр Беларусі і менш беларускае месца чым Гродна, якое пасля I сусветнай вайны рыхтавалася на горад з польскім, а не беларускім абліччам. Для палякаў Лука Дзекуць-Малей падаўся беларускім нацыяналістам і выжылі яго з Гродзеншчыны на Палессе. А тут жа меў за сабой вопыт беларускага настаўніка і БНРаўскага камісара на акругу Крынкі — Лунна. У 1918 г. арганізаваў беларускую школу ў Крынках. У асяроддзі брэсцкіх баптыстаў захавалася калекцыя здымкаў, сярод якіх — група крынкаўскіх дзетак з дырэктарам беларускай школы Лукой Дзекуцем-Малеем. Здымак быў перададзены ягонай унучцы Альжбеце, якая жыве ў Гданьску. Ніхто зараз не памятае тых часоў, бо мінула 90 гадоў ад той асветніцкай ініцыятывы. І дзяцей са здымка ўжо няма на гэтым свеце. Магчыма, што і ў Крынках таксама захавалася такое фота з 1918 г.: Лука Дзекуць-Малей з двума настаўнікамі і грамадкай бедных дзяцей. Не кажу, што гэта важны здымак для гісторыі Крынак, бо ён сам сабой сведчыць пра сваю вагу.

Калі прыйшлося Луку Дзекуць-Малею жыць у Брэсце ў міжваенны перыяд, адвярнуўшы яго ад беларусаў Беласточчыны і Гродзеншчыны, меў за сабою жонку Серафіму, беларускую настаўніцу родам з падгродзенскай Стругі і прыхаджан — братоў і сёстраў, рассеяных па Палессі і Бельшчыне ды Гайнаўшчыне. Для беларускага народа супольна з жонкай паціхеньку заняўся перакладамі паасобных евангелляў на беларускую мову, выдаваўшы іх спярша маленькімі кніжачкамі, а пасля — у 1931 г. у Лодзі (афіцыйна ў Хельсінгфорсе) увесь „Новы запавет і псальмы” (перавыдаваны пару разоў на эміграцыі і дасыланы ў Беларусь). Усю сваю „прадукцыю” ў міжваенны час развозіў на ровары па братах і сёстрах ад Пінска па Белавежу, не здраджваючы нікому, што ён яе аўтар. Сёння сведчаць пра тое яго пісьмы да Антона Луцкевіча, захаваныя ў віленскіх архіўных фондах, ды жывая яшчэ людская памяць на Беласточчыне. Такія кніжачкі прыйшлося пару гадоў таму назад атрымаць у падарунку ад Веры Валкавыцкай з Беластока, якая нават расказала, што Серафіма і Лука Дзекуці-Малеі былі гасцямі ў іхнім доме ў Орлі. Захаваліся здымкі з супольных сустрэч, якія публікаваліся ў беластоцкай „Ніве”. Веры Валкавыцкай запамяталася Серафіма ў прыгожым зялёным касцюме, купленым пасля выдання „Новага запавету”. Дарэчы, шмат хто з даваенных баптыстаў з Беласточчыны памятае Луку Дзекуця-Малея. Некаторыя, выехаўшы пасля вайны на Узбярэжжа, далучыліся да ягонага збору.

Для баптыстаў, у тым ліку і гданьскіх, Лука Дзекуць-Малей стаў святой асобай, быццам евангеліст. Пару гадоў таму назад выступілі яны да прэзідэнта горада Гданьска з ініцыятывай назваць вуліцу яго імем. Папрасілі падтрымкі ў Беларускага культурнага таварыства „Хатка” ў Гданьску. Прэзідэнт Гданьска Павел Адамовіч у 2003 годзе на спецыяльнай сесіі рады горада Гданьска 25 сакавіка — у 85 угодкі БНР — прадставіў прапанову, каб імем Лукі Дзекуця-Малея назваць вуліцу ў цэнтры горада. Гарадская рада прыняла прапанову аднагалосна. Перад раднымі выступілі: Міраслаў Паталён — прэсвітар баптысцкай царквы ў Гданьску, Лена Глагоўская — ад БТК „Хатка”, доктар Данель Дзекуць-Малей — сын Лукі, Альжбета Дзекуць-Малей — унучка Лукі. На гданьскім радыё прагучалі праграмы пра беларускага і баптысцкага дзеяча.

Варта згадаць, што беларуская дзейнасць Лукі Дзекуця-Малея замоўчвалася ў пасляваенны час. Можа і таму ў „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” агучана, што памёр ён у ЗША, а не ў польскім Гданьску. Але пасмертны лёс яму паспрыяў — выпадкова гданьскія беларусы знайшлі яго магілу на гарнізонным могільніку ў Гданьску. Затым знайшлі і сям'ю — сына ды ўнучку і праўнука. Унучка напісала пра свайго дзеда магістэрскую працу. Сын Данель атрымаў з архіва Інстытута нацыянальнай памяці ў Гданьску кучу даносаў на свайго бацьку. На жаль, сярод даносчыкаў былі і свае людзі.

На надмагільным помніку Лукі Дзекуця-Малея ў Гданьску напісана на польскай мове фраза з евангелля паводле св. Яна: „Хоць памёр, жыць будзе”. Можа варта было б прапанаваць дзеячам у Слоніме, Гродне, Брэсце, Беластоку, каб і ў гэтых гарадах былі вуліцы ягонага імя?

Па слядах Мар'яна Пецюкевіча

Алесь АДАМКОВІЧ

29-30 верасня 2008 г. сябры Таварыства беларускай культуры ў Літве разам з дачкой слыннага этнографа і беларускага дзеяча ў Заходняй Беларусі і Польшчы, малавядомага на сваёй бацькаўшчыне Мар'яна Пецюкевіча, Марыляй наведалі яго родныя мясціны. Мэта вандроўкі — не толькі ўшанаванне памяці слыннага сына беларускай зямлі, але і спроба вяртання яго імя ў Беларусь.

Раніцай, у панядзелак, 29 верасня 2008 г. мы з Вільні накіраваліся ў чарговае падарожжа. Марыля Пецюкевіч, якая першы раз у сваім жыцці была ў Беларусі, захаплялася хараством маляўнічых беларускіх пейзажаў і не хавала задавальнення ад таго, што ёй пашчасціла ўбачыць беларускую вёску практычна такой, якой памятаў яе бацька.

Першым месцам, якое мы наведалі, стаў Браслаў, дзе завіталі ў краязнаўчы музей, ад якога Марылька не менш уражана, і ў які перадала некалькі асабістых дакументаў Мар'яна Пецюкевіча. А ў яго экспазіцыях пабачыла матэрыялы, прысвечаныя і свайму бацьку. Тут таксама даведалася і аб гісторыі Браслава і ваколіц з сівой даўніны каменнага веку і да нашых дзён. Экскурсію правёў супрацоўнік музея Аляксандр Панцялейка.

Думаю, самым хвалюючым і запамінальным момантам для спадарыні Марыі было наведванне Цяцерак — роднай вёскі бацькі. Там ёй давялося сустрэць людзей, якія не толькі яго памяталі, ці нешта чулі аб ім, але змаглі падзяліцца і ўспамінамі. А на вясковых могілках у Барадзенічах, дзе між іншым спачываюць продкі сямейства Пецюкевічаў, убачылі некалькі надпісаў на надмагільных помніках на беларускай мове. І тут уразіў такі момант, што большасць з іх зроблена апошнім часам, пасля 2000 г. Значыць, для Беларусі яшчэ не ўсё страчана, а ўсведамленне таго, што і беларусы маюць права на сваю мову не толькі ў хатнім абыходзе, але значна шырэй, павялічваецца.

Праязджаючы праз Шаркаўшчыну, сваім святым абавязкам палічылі мы наведванне магілы патрыёта Беларусі ксяндза Зянона Якуця, які шмат цярпеў ад польскіх улад за сваю беларускую дзейнасць у мясцовым парафіяльным касцёле. Памёр, маючы толькі 30 год. Зараз спачывае ў сваёй беларускай зямлі і прабывае ў нябеснай бацькаўшчыне, дзе яму ўжо больш ніхто не замінае быць беларусам.

Як заўжды, надзвычай цёпла і гасцінна прыняла нас у Германавічах у сваім музеі Ада Райчонак. Аб гэтай жанчыне і аб яе дзейнасці можна расказваць і расказваць. Гэта яна ў вёсцы Германавічы (былым мястэчку) стварыла тры музеі. Гэта дзякуючы толькі ёй у Шаркаўшчынскім раёне праводзіцца велізарная праца па захаванні беларускасці. Яна была адной з першых, хто стаяў ля вытокаў вяртання імя Язэпа Драздовіча ў беларускую культуру і стала адным са збіральнікаў і захавальнікаў яго спадчыны. Гэта яна арганізоўвае кожны год мастацкія пленэры. І вось яна стварыла ў звычайнай вёсцы мастацкую галерэю, на жаль, яшчэ не запатрабаваную вяскоўцамі. Тут жа мы сустрэліся і з другім вядомым краязнаўцам Кліменціем Кажаном, які вядомы сваімі краязнаўчымі працамі па гісторыі Шаркаўшчынскага рэгіёна.

На начлег мы спыніліся ў маіх бацькоў у вёсцы Зорка, дзе яшчэ доўгі час дзяліліся ўражаннямі ад пройдзенага дня і складалі планы на будучы дзень, у які працягвалася наша знаёмства з рэгіёнам, а Марылі — з Беларуссю. Наведваючы розныя мясціны і іх насельнікаў, мы пакідалі там кнігі Мар'яна Пецюкевіча з тым, каб людзі змаглі пазнаёміцца з гэтай шматграннай асобай, непахісным патрыётам Бацькаўшчыны.

І напрыканцы важна адзначыць, што, праязджаючы па Браслаўшчыне і Шаркаўшчыне, мы заўважылі, што вёска дадзеных рэгіёнаў яшчэ захавала нямала элементаў з пачатку XX стагоддзя, а ў некаторых месцах і значна старэйшых. Таму хацелася б, каб даследчыкі жыцця і светапогляду беларусаў звярнулі на гэта ўвагу і змаглі б зафіксаваць тое, што засталося для будучых пакаленняў, бо ўжо хутка, год праз дваццаць, нічога гэтага не будзе. Стаяць і развальваюцца старыя дамкі з гаспадарчымі пабудовамі, паміраюць старажылы, сведкі прабегшага часу, які замяніў продкавыя дні з архаічнай патрыярхальнай вёскай на сучасную, матэрыяльную, без мовы і традыцый...

Мінулае і сённяшняе Чаромхі

Гартаючы газетныя выразкі, трапіўся мне ліст гараджаніна з цэнтральнай Польшчы, які гасцяваў у Чаромсе і пра свае ўражанні напісаў у штодзённку „Gazeta Współczesna”. Допіс „У Чаромсе па-старому” газета надрукавала 21 жніўня 1984 года. Вось поўны змест таго допісу. „Od kilku lat obserwuję życie społeczno-gospodarcze Czeremchy i z przykrością muszę stwierdzić, że nic tu w zasadzie się nie zmienia. Weźmy handel. Są dwa domy towarowe i kilka punktów ogólnospożywczych. Z ich zaopatrzeniem — to pożal się Boże. Nie wiadomo również, kiedy są otwarte: taki lokalny totolotek. Sporo do życzenia pozostawia restauracja „Przygraniczna”. Co prawda jedzenie jest tu smaczne i niedrogie, lecz z napojami gorzej niż źle. Piwo można wypić tylko od święta, tymczasem w okolicznych wioskach jest go pod dostatkiem. O braku stałego lekarza w ośrodku zdrowia, pracy Urzędu Gminy, wezwaniach pogotowia ratunkowego — nie piszę, bo jest to po prostu lekceważeniem ludzi. Może jestem zbyt surowy w ocenie tutejszych realiów (pochodzę z dużego miasta i do Czeremchy przyjeżdżam na wakacje), lecz wiem, że mieszkańcy tej sympatycznej osady pragną, aby żyło im się wygodniej i spokojniej”.

Такой бачылі Чаромху прыезджыя амаль чвэрць стагоддзя таму. Праўду сказаўшы, пад гэтым лістом і я падпісаўся б, бо гэта ўсё была праўда. Зараз нешта перамянілася ў пасёлку, хоць і надалей нявырашанымі засталіся праблемы з хуткай дапамогай ці афармленнем спраў у Гміннай управе. Але не стану паўтарацца, бо неаднойчы пісаў я аб гэтым на старонках „Нівы”. А наконт гандлю і піва скажу такое: у рыначнай эканоміцы прадпрымальнікі на любы спосаб маняць да сябе пакупнікоў. Усяго ўдосталь, абы грошы былі, ды і крамы працуюць „звыш нормы”, бо прыбытак лічыцца. А піва ў наваколлі мора, як у Чаромсе, так і на вёсках. Гэта кашмар вясковых жанчын, бо мужыкі там пакідаюць шмат грошай. Але на гэта няма паратунку. Традыцыя спажывання мацнейшых напіткаў зацягваецца ў нас ад пакаленняў.

Уладзімір СІДАРУК

Небяспечныя бярозы пры дарозе

З Новага Ляўкова ў Нараўку бяжыць ваяводская асфальтавая шаша. Перад Плянтай першы за Ляўковам круты паварот. І тут у рове стаіць пахіленая бяроза, якая затрымалася сваёй верхавінай у голлі другога дрэва. Калі будзе падаць, дык, па ўсім відаць, на маставую дарогі. А вядома ж — па маставой ездзяць аўтамашыны і веласіпедысты, а ходзяць пешаходы. Бяроза вісіць над іх галавой. Дадам, што побач стаіць засохлае дрэва. З яго ў час, калі вее вецер, падаюць галіны.

Другая пагроза за чыгуначным пераездам ды ў апошнім пералеску за Плянтай. Тут у рове з правага боку вецер зламаў бярозу і вялікая яе верхавіна трымаецца „на валаску” свайго ствала. Дрэва можа звaліцца на дарогу, на праязджаючых.

Дарожныя службы пашкоджаных дрэў не заўважаюць і іх не забіраюць. Чакаюць, калі паваляцца яны на абочыну і маставую гэтай рухлівай дарогі? **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Страшылкі на наймалодшых

Кандрату Косціну з Мінска два з паловай годзіка. Хлапец разам з мамай завітаў у Беласток. Тут на Радыё „Рацыя” працуе тата малога. Кандрацік непаседа. Хопіць азірнуцца і ўжо няма яго! Схаваецца так, што са свечкай не знойдзеш! Дзеці, як ніхто, баяцца страшылак. Бацькі таксама маюць спосаб на малога. Яны пужаюць Кандраціка такой страшылкай: „Не бяжы, бо *зюзя* ўхопіць!” — кідае ўздагон малому мама.

Кандрацік вельмі баіцца *зюзі*!

І слушна. Гэтае таёмнае слова абазначае імя старажытнага бога зімы *Зюзю*. Як верылі нашыя прапрапрапрадзеды, *Зюзя* адным подыхам можа замяніць вас у ледзяша або снегавіка!

Цікава, што апрача *зюзі* дзяцей палохалі *дундай* або *мумай*...

А можа ведаецце іншыя страшылкі?

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вандроўкі па супермаркетах!

Чаму дзеці і асабліва наша моладзь любяць пабываць у галерэях? Тут маем на думцы ўсякія супермаркеты, якія ў апошні час размножыліся ў нас як грыбы пасля дажджу. І заўсёды ў іх процьма пакупнікоў, асабліва тых маладых. Я ўжо нават баюся хадзіць у такія месцы. Заўсёды сустрэну там нейкіх знаёмых дзетак. Найгорш, калі бачу іх у час заняткаў у школе. Значыць, у іх... прагул!? Непрыемная справа!

Сапраўды, галерэі найлепшае месца для прагулаў і ўцёкаў са школы. Тут можна прыемна і вясёла правесці час, нават паесці. А калі ў нас няма грошыкаў, там заўсёды бываюць нейкія прамоцыі. На захадзе даўно ўжо прыкмецілі гэтую з'яву. Дзеткі, якія без патрэбы бадзяюцца па галерэях у час школьных заняткаў, атрымалі нават сваю назву: *магазінныя пацукі!*

У Беластоку пабыўка ў магазіне-галерэі гэта пакуль прэстыж. Там маладыя дамаўляюцца на сяброўскую сустрэчу, ладзяць імяніны, назначаюць рандэву. Але найбольш там такіх, якія без мэты шлындаюцца для забіцця часу!

Мяне вельмі ўзрушыла сустрэча класных сябровак, якія раптам не бачыліся... дзве гадзіны. Дзяўчаты кінуліся сабе ў абдымкі і пацалаваліся на прывітанне. Пасля доўга шчабяталі пра тое каго яшчэ сустрэлі ў гэтым месцы. (Аказваецца, апрача іх тут пабывалі яшчэ чатыры асобы з іх класа). А як абажаюць галерэі маладыя з нашых мястэчак і вёсак?! Большасць ужо не ўяўляе сабе пабыўкі ў горадзе без экскурсіі па супермаркетах. Прытым такая пабыўка найчасцей прыносіць стрэс. Немагчыма ж купіць усе жаданыя рэчы.

Ёсць, вядома, і такія, якія смяюцца з „абавязковых” пабывак у галерэях. Нядаўна я пачула смешную гісторыю. Да маіх знаёмых прыехалі гімназісты з Саколкі. Яны адразу захацелі перціся ў самую новую і модную галерэю. Іх беластоцкія, замест у супермаркет, павялі іх у магазін секанд-хенд, або, як кажуць у нас, у «шматлянд». Спачатку прыезджыя былі ў шоку! З часам гульня ў «пакупкі» ім вельмі спадабалася. Колькі было смеху! Бо ў секанд-хендах, як у крывым люстры, можам пабачыць нашы вандроўкі па галерэях. Тут таксама можна зразумець, што ў магазін трэба хадзіць за канкрэтнымі пакупкамі. Найлепш з мамай або старэйшай сястрой. І купляць толькі патрэбныя і практычныя рэчы. Інакш, яны будуць ляжаць непатрэбнымі ў нашых шафах і гардэробах. Пасля іх без жалю выкінем на сметніцу або занясем... у секанд-хенд.

У такіх месцах добра відаць колькі вартыя «непатрэбныя» рэчы. І мы, калі ўпустую растрацім свой час, адчуваем сябе сумнымі і непатрэбнымі. Нават, калі ў нашых руках поўныя пакеты пакупак!

ЗОРКА

Восень -чараўніца

Цэлае лета прабегала Бярозка па лесе ў сваёй зялёнай шаўковай сукенцы. Колеры на сонцы выгаралі, галінкі і сукі чапляліся за рукавы, падол. Усё паабрывалася. Глянула неяк Бярозка ў люстэрка-возера і горка заплакала: «Як жа мне ў гэткім строі на вочы іншым дрэвам паказвацца?»

А тут і гаспадыня-Восень у лес завітала. Паспачувала Бярозцы, суцешыла: «Бачыш, колькі ў мяне тканінаў, фарбаў? Выбірай якую хочаш». Глянула Бярозка і вочы ў яе разбегліся: чырвоны, барвовы, пунсовы, жоўты ўсіх адценняў — якіх толькі колераў у скарбонцы багатай Восені не было! Выбрала яна светла-залацісты. Дакранулася Восень сваёй чароўнай палачкай да Бярозкі — і ўраз дрэўца апранулася ў залацістыя строі.

Іншыя дрэўцы таксама захацелі новыя ўборы займець. І нікога яна не пакрыўдзіла. Усіх багата апранула. І да Елачкі дакранулася. Але тая, пахмурная і непрыветная, укалола гаспадыню сваімі іголкамі. Адышла Восень, пакінуўшы Елку ў старой пацямнелай зялёнай сукенцы. Так і стаіць яна — заўсёды зялёная — між іншых дрэўцаў у нашым лесе.

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

Міра ЛУКША

Свіння са Свінарояў

Свінні Фросі засталося
На залатую восень:
Хацела пажыць на пакоях.
Пасялілася ў Свінароях.
Выгадна і цёпла Фросі,
І ежу ёй смачную носяць,
І чухаюць па спінцы,
Усяляк годзяць свінцы
І не палохаюць свіным
Лёсам незавідным.
Каб табе, Фрося,
Як найлепш жылося,
Паставілі табе ў Свінароях
Цуда зусім не свіное,
Бо не толькі карытца
Важнае, каб нажыцца,
Каб мець кантакт са светам,
З нашай усенькай планетай:
Інтэрнэт паставілі ў хаце.
У сеціве Фросю шукайце!

Зося з пятага „а” класа

— 1 —

Калі Зося Гняздоўская вырашыла паступаць у II Агульнаадукацыйны ліцэй, яна не ведала, які ёй выбраць профіль. За тры гады вучобы ў гімназіі дзяўчына страціла цікавасць амаль да ўсіх прадметаў. Настаўнік геаграфіі гаварыў ціха і неразборліва, на біялогіі ўсе рашалі дамашнія ўрокі па англійскай мове. Хоць настаўніца хіміі апраналася ў белы халат, яна ніколі не правяла хімічнага даследавання; гімназісты падазравалі што яна размінулася з прызваннем і ўяўляе сябе лекарам...

З гуманітарнымі прадметамі было яшчэ горш. Настаўніца польскай мовы паводзіла сябе так, быццам не памятала якое ў яе прозвішча. Зоркай у гімназіі быў прафесар Кадук, настаўнік гісторыі. Вучні празывалі яго *танным* філосафам, таму што з урока на ўрок мяняліся яго погляды. Апрача гэтага ён чытаў Біблію на рускай мове і піў суп са слоіка, калі правяраў прысутнасць. Заставалася адна матэматыка. Выкладчыцай гэтага прадмета была выхавацелька Зосі, таму яна і ўсе яе сябры зубрылі задачы і ўраўненні. На жаль, у матэматычным класе ў ліцэі фізіка выступала як галоўны прадмет. Зося крыху баялася фізікі, але ў яе не было вялікага выбару. У апошні дзень яна рашыла, што ўсё ж такі паступіць у матэматычна-фізічны клас, з англійскай і нямецкай мовамі. Яе найлепшыя сяброўкі таксама паступалі ў гэты ліцэй, аднак у гуманітарны клас. Яны спрабавалі заахвоціць Зосю, каб і яна паступала разам з імі:

— Ты будзеш вымушана пісаць *матуру* па фізіцы, — асцерагала яе Паўліна. — Ці ты справішся з гэтым?!

— У нашым класе ёсць латынь і філасофія, — намаўляла Оля, — цікава, ці прыдадуцца нам веды ад спадара Кадука?!

У канцы адазвалася Ада:

— У матэматычна-фізічным класе адны хлопцы. З кім ты будзеш там сябраваць?

— Гэта не бяда, — сказала Зося, — мне нават лепш, што там будзе многа хлопцаў, прынамсі будзе з каго пасмяяцца!

— Рабі, што хочаш! — пагневалася Ада. — Я думаю, што доўга не вытрымаеш у матэматычна-фізічным класе. Пабачыш сама, пасля месяца ты будзеш вымушана перайсці ў іншую школу...

Апошнія словы ўсхвалявалі і адначасова мабілізавалі Зосю і яна канчаткова рашыла што пойдзе ў матэматычна-фізічны клас. І зробіць усё, каб яе ацэнкі былі лепшыя як у сябровак.

тэкст:wodorotleneks2@wp.pl
дызайн:paulina@wp.pl

Музыка з кайфам

Пяць або сем? — „Seven B”

Адкуль пайшоў назоў гурту? Прызнаюся, не ведаю. Але гэта важны гурт для польскага ды беларускага блюза. Пакуль вядомыя зараз беларускія музыкі патрапілі на польскія сцэны, артысты з „Seven B” былі ўжо вядомыя сухачам з-над Віслы.

„Seven B” паўстаў у 1990 годзе ў Гродне. Пачаткова граў у самім Гродне і ваколіцы, але ў 1992 годзе яго заснавальнікі Жэнік Лёска ды Андрэй Макарэвіч апынуліся летам пасярод сувальскіх азёраў (у польскім Аўгустове). Пачалі яны выступаць перад мясцовай публікай, у якой хутка заваявалі папулярнасць. Тады пераехалі жыць у Беласток, а далей у Кракаў, дзе пасяліліся і да сёння ствараюць музыку.

„Seven B” вядомы ў Польшчы перад усім слухачам блюза. Гурт выконваў музыку, якая спалучае энергію рока з блюзавай настальгіяй. За пятнаццаць гадоў сваёй дзейнасці музыкі (склад гурту пару разоў мяняўся) наведалі шматлікія фестывалі ў цэлай Еўропе. Выступалі на „Singen-festival” (над Бадэнскім возерам), „Muehlbergfest” ці фестывалю „Michelstadt Vatertag”. У Польшчы прэзентаваліся на найбольшых блюз-фестывалях, м.ін.: „Rawa Blues Festiwal”, „Sopot Blues Festiwal”, „Jimiway Blues Festiwal”, „Festiwal im. Ryśka Riedla”. Самае цікавае, запісы „Seven B” можна было пачуць на радыёгітпарадах у Нямеччыне, Данii ці ЗША. У галоўным творчасць гурту — на англійскай мове, зразумелай ва ўсім свеце блюза, але таксама таму, што стыль найхутчэй адпавядае паўднёваамерыканскай блюзрокавай сцэне. Часта ў іх выкананні можна было пачуць класіку з рэпертуару гуртоў „Lynyrd Skynyrd”, „Led Zeppelin”, „Rolling Stones” ці Джэніс Джоплін.

Свет пабачыў тры альбомы гурту: „Acoustic”, „Make Up Your Mind”, „Rocktales”. Апошні прэзентаваўся яшчэ ў 2005 годзе. З таго часу гурт не працуе. Затое выступае яго лідар, як кажуць крытыкі, вельмі характэрны ды харызматычны. Яго праект „Gienek Loska Band” у мінулую пятніцу выступаў між іншым у Беластоку з нагоды адкрыцця „Алеі блюза”.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

У лекара

Азваўся раптам лекар
Да хворага чалавека:
— Пазбягайце працы такое,
Што звязана з галавою.

— Дык немагчымае гэта.
— А можа вы паэтам?
— Не пішу я нікалькі,
Я цырульнікам толькі.

Лацінны адказ

Запыталіся Вацка:
— Колькі гадоў твайму бацьку?
— Бацьку ж у гэту восень
Споўнілася гадоў восем.

— Гэтае ж немагчыма,
Бацька ва ўзросце сына?
— Бацькам ён, без сумнення,
Ад майго нараджэння.



Польска-беларуская крыжаванка № 41

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 37:

Міт, памяць, камін, параход, пачатак, см, лад, яма, фан, дар, статак. Маг, палац, качан, парад, тамат, вянок, яда, смак, камар.

Узнагароды, кампакт-дыск з беларускімі казкамі, выйграла **Анна Зубрыцкая** з Беластока. Віншуем!

Родам з Беласточчыны

У пошуках слядоў Адама Бычкоўскага

Сяргей ЧЫГРЫН

Шукаючы звесткі пра беларусаў, якія былі родам з Беласточчыны, даўно мяне зацікавіла асоба Адама Бычкоўскага — беларускага грамадскага актывіста, арганізатара і першага старшыні Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, адваката і драматурга.

Першыя звесткі пра яго апублікавала Зоська Верас у „Беларускім календары 1981", калі распавядала пра стварэнне Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Зоська Верас прыгадала восень 1909 года, калі ў маленькім памяшканні Францішка Грынкевіча ў Бернардынскіх мурах у Гародні сабралася невялікая грамадка моладзі. Гэта быў арганізацыйны сход беларускага гуртка. „Былі там гімназісты апошніх класаў: Адам Бычкоўскі (дваюрадны брат рэдактара віленскага „Беларуса" Антона Бычкоўскага), Ф. Эйсмант, П. Алексюк, сёстры Ганна і Марыя Салянкі, Галена Шэгідэвічанка (ужо закончыўшыя школы) і я — Людвіка Сівіцкая, вучаніца шостага класа. Абмеркавалі патрэбу стварэння сваёй арганізацыі, узгаднілі яе назву: Гродзенскі гурток беларускай моладзі (ГГБМ), абдумалі, якую зрабіць пячатку і выбралі праўленне („урад") гуртка ў складзе: А. Бычкоўскі — старшыня, П. Алексюк — намеснік старшыні, З. Абрамовіч — сакратар і Л. Сівіцкая — бібліятэкар", — згадвае Зоська Верас. Далей яна піша пра тое, як гурток выступаў у вёсцы Бяляны на Сакольшчыне. Там Адам Бычкоўскі прачытаў даклад на тэму „Адгалосак душы беларускага народу ў яго песнях, казках і легендах", потым артысты паказалі спектакль „Модны шляхцюк" па п'есе Каруся Каганца, рэжысёрам якога быў Бычкоўскі, затым распавялі і іншыя звесткі пра сам гурток. У канцы ўспамінаў Зоська Верас у зносках расказала кароткую біяграфію Адама Бычкоўскага. Адсюль мы даведаліся, што ён нарадзіўся ў 1889 годзе ў фальварку Талочкі Сакольскага павета. Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, працаваў суддзёй на Сакольшчыне, а ў 1930-х гадах — адвакатам у Варшаве. Быў адным з заснавальнікаў Асветнага таварыства беларусаў у Варшаве. Вось і ўсе звесткі, якія нам пра Адама Бычкоўскага пакінула Зоська Верас.

Згадвае трохі пра Адама Бычкоўскага і Аляксей Пяткевіч у сваёй кнізе „Старонкі спадчыны" (Мінск 2006). Але ў гэтай згадцы ёсць і цікавыя факты з яго грамадска-культурнай дзейнасці. Напрыклад тое, што, калі Адам Бычкоўскі вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, актыўна вёў грамадска-патрыятычную работу ў сваёй ваколіцы, што прыводзіла нават да канфліктаў з паліцыяй. Ён быў вельмі папулярны і аўтарытэтны сярод моладзі. Паступіўшы на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, Адам Бычкоўскі актыўна ўключыўся ў беларускі рух, у працу Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў гэтага ўніверсітэта, быў заняты нават у спектаклі „Паўлінка" па п'есе Янкі Купалы.

Пасля ўніверсітэта Адам Бычкоўскі ажаніўся з польскай дзяўчынай. І гэтая жаніцьба на пэўны час адсунула яго ад беларускіх спраў. Спачатку ён працаваў суддзёй на радзіме, а потым пераехаў у Варшаву, дзе вёў адвакацкую практыку. Тут выпісвае беларускую прэсу, прымае самы актыўны ўдзел у беларускім руху. „Да яго, — як піша Аляксей Пяткевіч, — часта звярталіся самыя розныя хадакі з Заходняй Беларусі ў справе юрыдычнай абароны, і ён ахвотна дапамагаў. Жыццё А. Бычкоўскага, на жаль, рана абарвалася, памёр ён ад інфаркту ў сваім службовым бюро".

Адам Бычкоўскі займаўся не толькі юрыспрудэнцыяй, але і сам пісаў вершы і нават напісаў п'есу „У сваты". Гэтая п'еса нідзе не друкавалася. Арсень Ліс, згадваючы пра Бычкоўскага ў маленькай нататцы ў „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мінск 1994, т. 2, с. 152), памылкова называе гэту п'есу „Сваты", але пацвярджае, што яна была пастаўлена шэрагам самадзейных драматычных гурткоў у Заходняй Беларусі. На днях напісаў я ліст Аляксею. Адам Бычкоўскі, калі ажаніўся, фармальна адышоў ад беларускага руху, бо жонка была полька і не падзяляла яго нацыянальных захапленняў. Але ў душы да канца свайго жыцця ён заставаўся беларускім адраджэнцам і шмат рабіў, асабліва ў варшаўскі перыяд свайго жыцця. Адам Бычкоўскі заслугоўвае глыбокага вывучэння. Трэба шукаць пра яго звесткі ў архівах. Дарэчы, успомніў яшчэ адзін факт, які сведчыць пра тое, як любілі і цанілі Адама Бычкоўскага ў Гродзенскім гуртку беларускай моладзі. 9 траўня 1911 года, калі ён ужо вучыўся ў Пецярбургу, сябры гуртка паслалі яму том „Беларусаў" Яўфіма Карскага. На тытуле быў верш, прысвечаны яму. Пад вершам подпіс: „Дарагому сяброўку Адамаві Бычкоўскаму на добрую памяць ад ГГБМ" (лацінкаю) і 20 подпісаў сяброў гуртка. Цяжка сказаць, з якой нагоды быў гэты прэзент. Ён цяпер знаходзіцца ў Публічнай расійскай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Пра гэты факт згадваў Адам Мальдзіс. Затым пісаў мне і Мікола Нікалаеў з Санкт-Пецярбурга...".

Адам Бычкоўскі, 1912 г.

Гродзенскі гурток беларускай моладзі. Сядзіць у першым радзе крайні справа Адам Бычкоўскі, 1910 г.

Сапраўды, факты з жыцця Адама Бычкоўскага Аляксей Пяткевіч прывёў вельмі цікавыя. Я адразу напісаў па электроннай пошце пісьмо Зянону Пазьняку ў Варшаву. Але адказу так і не дачакаўся. Цяпер, відаць, Зянону Станіслававічу не да Бычкоўскага, хаця добра ведаю, што ён цудоўны даследчык беларускага тэатра. Тым не менш, падумалася: няўжо рукапіс п'есы „У сваты" мае Зянон Пазьняк? І калі гэтая п'еса ў яго ёсць, дык як яна да яго трапіла?

Памятаецца, як у другой палове 1980-х гадоў слонімскі паэт Анатоль Іверс неяк мне сказаў, што за год да сваёй смерці Пятро Ластаўка прыслаў у Слонімскі краязнаўчы музей свой хатні архіў, звязаны з Гальяшом Леўчыкам. Але гэты архіў так і не трапіў у музей, а дзесьці асеў у прыватным хатнім архіве. „Шукай, Сяргей, гэты архіў. Магчыма там ёсць шмат цікавых звестак", — казаў мне старэйшы паэт. І я яго да сённяшніх дзён шукаю. І пошукі мае недарэмныя.

Неяк у слонімскага калекцыянера даўніны Міхася Рылко запытаўся, ці ведае ён што-небудзь пра архіў Пятра Ластаўкі, які ён прыслаў з Варшавы ў Слонім. Калекцыянер памаўчаў, а пасля сказаў, што ў тым архіве былі звесткі і пра Гродзенскі гурток беларускай моладзі. Але гэты архіў раскіданы па прыватных архівах слонімцаў, а магчыма і часткова знішчаны. Дзе ўсё гэта — ён не ведае. У дадатак ён паказаў мне пісьмо ад Зоські Верас, адрасаванае яму асабіста. Зоська Верас у кастрычніку 1970 года пісала: „У Варшаве жыў і быў знаёмы з Пятром Ластаўкай адзін з арганізатараў і першы старшыня ГГБМ адвакат Адам Бычкоўскі. Памёр ён у 1937 годзе. На маю просьбу П. Ластаўка прыслаў мне весткі аб працы А. Бычкоўскага ў Варшаве за апошнія гады жыцця. Ластаўка напісаў успаміны аб Бычкоўскім і адрэдагаваў сцэнічны твор апошняга — „У сваты" і пераслаў у „Ніву". Гэтыя матэрыялы дагэтуль свету не ўбачылі. Астаўшыеся пасля А. Бычкоўскага памяткі: рукапіс сцэнічнага твору, фатаграфіі і г.д. Ластаўка пераслаў у Гродзенскі музей, хоць я вельмі не радзіла. І што ж, усё знікла! Ні ў Гродзенскім музеі, ні ў Дзятлаве — няма!.. Як і праз каго было ўсё пераслана — я не ведаю...".

Дзіўна. А пры чым тут Дзятлава?.. Тэлефаную дырэктару Дзятлаўскага раённага краязнаўчага музея Фёдару Красюку

працяг ☞9

8 ☞працяг і пытаю пра папку з дакументамі, пра архіў ГГБМ, але спадар Красюк адказаў, што нічога гэтага ў іх музеі няма і не было, бо ён даўно працуе дырэктарам і ўсе дакументы і экспанаты ў музеі добра ведае. Дык чаму згадвае ў сваім пісьме Зоська Верас Дзятлава?.. Хутчэй за ўсё яна пераблытала Дзятлава са Слонімам. Бо, менавіта, у Слонім нехта прывёз, альбо па звычайнай пошце сам Пятро Ластаўка прыслаў дакументы пра ГГБМ і пра Гальяша Леўчыка. Па іншай версіі, папкі з матэрыяламі пра Леўчыка і Бычкоўскага з Варшавы прыслаў нехта Уладзімір Станкевіч...

І ўсё ж пошукі мае не прайшлі марна. Бо многія слонімцы ведаюць, што я шукаю сляды знакамітых беларусаў. У мяне часта пытаюцца пра людзей, пра гістарычныя мясціны, пра помнікі, прыносяць у рэдакцыю „Газеты Слонімскай", дзе я працую, розныя старыя рэчы, фотаздымкі, кнігі. І вось нядаўна патэлефанавала адна сланімчанка і сказала, што яна дома знайшла папку, дзе ёсць нейкія дакументы на польскай мове. „Калі яны вас зацікавяць, я вам іх падарую", — сказала жанчына.

Я знайшоў вольны час і паехаў па ўказаным адрасе. Жанчына-пенсіянерка сустрэла мяне ветліва і на стол перада мной паклала тоненькую папку на якой па-беларуску было напісана „Адам Бычкоўскі". Я атрымаў шок. У папцы ляжалі некалькі газетных выразак, прысвечаных Гальяшу Леўчыку, адзін лісцік з пачаткам артыкула Пятра Ластаўкі „Апошнія гады жыцця Гальяша Леўчыка", біяграфічная даведка, напісаная рукой Зоські Верас, пачатак успамінаў Пятра Ластаўкі з нагоды 30-годдзя з дня смерці Адама Бычкоўскага, фотаздымак Зоські Верас у ролі Ганкі са спектакля „Модны шляхцюк" па п'есе Каруся Каганца з 1911 года і г.д.

Успамін пра Бычкоўскага пачынаецца вельмі цікава, але ён абрываецца на самым загадкавым месцы. Тым не менш, хачу згадаць тое, што ўдалося знайсці, і што было напісана Пятром Ластаўкай у 1967 годзе: „Восенню 1935 года будучы праездам у Вільні, у рэдакцыі часопіса „Шлях моладзі", ды іншых беларускіх арганізацыях, атрымаў шмат адрасоў беларусаў, пражываючых у Варшаве, якой і я быў тады ўжо жыхаром. Патрэбай гэта мне было дзеля паклікання да жыцця беларускай арганізацыі ў сталіцы Польшчы, дзе сотні было хатніх працаўніц, работнікаў і інтэлігенцыі, якія ў пошуках хлеба і працы масава выязджалі з Заходняй Беларусі. Узбагачаны адрасамі асоб, якіх некаторыя прозвішчы былі шырока ведамыя і польскаму грамадству, як праф. Ст. Казура і Бр. Руткоўскі, былі Р. Зямкевіч, Г. Ляўковіч, Я. Гапановіч і, між іншым, адвакат Адам Бычкоўскі. Гэта мяне моцна ўцешыла, што ў нашым асяроддзі будзе адвакат, які несумненна якраз і будзе бараніць нашы агульнаграмадскія справы перад санацыйнымі ўладамі. Дзеля таго, маючы ўжо падрыхтаваны праект статуту, у першую чаргу выбраўся на вуліцу Długa, дзе адвакат вёў сваё бюро. У пачакальні было некалькі асоб. Не чакаючы сваёй чаргі, напісаў картачку па-беларуску, склаў і падаў апліканту, каторы якраз выйшаў у пачакальню. Цікавіла мяне надта, як адвакат прыме маю пісульку ў беларускай мове, бо да гэтай пары не знаў Бычкоўскага. Не паспеў яшчэ ўсадовіцца да чакання на сваю чаргу....". Далей успамін Пятра Ластаўкі абрываецца, бо напісаных лістоў пра Бычкоўскага больш у папцы не было. Вельмі шкада! А можа гэты ўспамін дзесьці ўжо друкаваўся? Пакуль я адказаць не магу.



Афіша-паведамленне аб смерці Адама Бычкоўскага, Варшава, 1937 г.

Але шок я атрымаў не ад гэтых папер, якія там былі і, якіх, сапраўды, у папцы, не хапала, а ад таго, што побач з імі ляжаў рукапіс на 18-ці вялікіх, пажаўцелых ад часу лістах, п'есы Адама Бычкоўскага „У сваты". П'еса напісана лацінкай (вось чаму сланімчанка падумала, што яна напісана па-польску) чорным чарнілам. На першым лісце рукапісу чытаю: „U swaty", 1910 года, Гародня. На апошнім лісце рукапісу словы: „Napisaú A. Jaśkaú". Гэта быў псеўданім Адама Бычкоўскага. Скажу, што п'еса „У сваты" яшчэ нідзе не друкавалася. Цяпер ёсць надзея, што яна з'явіцца ў друку, амаль праз 100 гадоў пасля яе напісання. І побач з Карусём Каганцом, Янкам Купалам, Леапольдам Родзевічам, якія адраджалі беларускую драматургію ў самым пачатку XX стагоддзя, мы ўпішам імя і драматурга з Сакольшчыны Адама Бычкоўскага.


Рукапіс п'есы „У сваты" Адама Бычкоўскага, 1910 г.

На першым лісце рукапісу зверху сінім чарнілам лацінкай напісана: „Рукапіс адваката Адама Бычкоўскага" і подпіс... не абы-каго, а таго самага Пятра Ластаўкі. Значыць, паэт Анатоль Іверс меў рацыю, калі казаў мне пра архіў Ластаўкі, які ён прыслаў у Слонім. Толькі, на вялікі жаль, усіх дакументаў там не аказалася, альбо яны згубіліся, альбо ляжаць дзесьці ў іншых сховішчах ці ў прыватных зберажэннях. Таксама паўстае пытанне: ці гэта быў адзіны арыгінал п'есы „У сваты" Адама Бычкоўскага, ці ён сваёй рукой перапісаў некалькі паасобнікаў і яны недзе захоўваюцца?..

Да сказанага вышэй хачу дадаць, што шукаючы сляды Адама Бычкоўскага, натрапіў на два яго фотаздымкі, а таксама знайшлася, выдадзеная ў Варшаве на польскай мове, афіша-паведамленне аб ягонай смерці. Афішу такую заказалі і выдалі жонка, дачка, брат Антон і свакі Адама Бычкоўскага. У ёй паведамляецца, што Адам Бычкоўскі памёр 18 лістапада 1937 года ва ўзросце 48 гадоў. Адпявалі яго ў капліцы касцёла святога Яна ў Варшаве і 22 лістапада наш зямляк быў пахаваны...

Хочацца верыць, што гэта публікацыя трапіць у рукі дачцэ Адама Бычкоўскага, альбо яго ўнукам ці праўнукам, і яны адгукнуцца. Скажу яшчэ, што стрыечны брат Адама — Антон Бычкоўскі быў першым рэдактарам газеты „Biełarus", што выходзіла ў Вільні ў 1913-1915 гадах. Пошукі пра славутых беларусаў з Сакольшчыны Адама і Антона Бычкоўскіх працягваюцца.

Яз эп ПАЛУБЯТКА

Судны дзень

Ісус маўчаў, а Саваоф не слухаў.
Свае каменні раскідаю сам.
Іду жыццёвым шляхам да Галгофы.
Нас толькі смерць уратуе ад жыцця.
Які вялізны ложак без цябе.
Любая! Сёння я зноў заработак прапіў!
Партыі веру, як жонцы сваёй.
Абрыдла мне маё каханне.
Хачу на пенсію хутчэй.
А хто наступны будзе правіць баль?
Сустрэў цябе ў ліхую я гадзіну.
Я гэта чуў яшчэ у першым класе.
Засыпае Чарнобыльскі попел сляды.
І зноў іду я на паклон да бюракрата.
Прыязнасці тваёй не бачыць
мне ў труне.
Мітусяцца людзі ў сталіцы.
Крывыя ногі выстаўляеш на паказ.
Сусвет пакрыты брудам чалавечых
перамог.
Яго псавалі разважанні.
Воляю голад не наталіш.
Як смачна пахне кіслая капуста.

Гутарка

Сусед кахае тваю жонку.
Хачу цябе адлупцаваць.
Святы чацвер! Цябе я бачу зноў!
Не кіпі! Будзь такою гарачаю ноччу!
Ішла па вуліцы, як быццам бы чужая.
Нельга так словам калечыць.
Ад любасці тваёй маўчу каторы дзень.
Доўгавалосая, лахматая,
сівая прыгажосць.
Такія вусны! І такі язык.
Са шляху светлага хачу
звярнуць налева.
Зноў прэзідэнт хваліў сябе.
Чужыя хібы цешаць чалавека.
На развітанне плюнула ў душу.

Палітыка

Зноў падпісалі нейкую дамову.
Вар' яцкі час шнуруе чарадой.
З летам апошнім надзея памерла.
Дарэмныя твае ўсе намаганні.
Табе не хапае мяне.
Аб „сціпласці" тваёй гаворыць
увесь сусвет.
Добразычлівасцю ты бачу не хварэеш.
Дзіўны пах ад тваіх шкарпэтак.
Сваю Галгофу насыпаю сам.
За тыдзень каханне размаўляла
ўпершыню.
Да сексуальнай рэвалюцыі дайшлі.
Я бульбы печанай хачу.
Мне так адзінока ў натоўпе людскім.
Табой калісьці ганарыўся я.
Пакахай мяне каханы.
Прапаную, купіце мяне.
Я хацеў бы ў гарэме слугой працаваць.
Я нявольнік уласных пачуццяў.
Шушкевіч зноў казаў пра
талерантнасць.
У мяккім фатэлі сядзела гаўно.
Хачу з табою пераспаць.
Ты згубіла ў царкве пяшчоту сваю.
Ты назвала скацінай мяне.
Каб ты такою спраўнаю была
ў ложку.
А я хачу цябе яшчэ і днём.
Так хочацца разумным быць.
Блудніца зноў захацела мяне.
Мужык быў з бабскай душой.
Не кожная птушка лётае ў небе.
А думак, думак поўны тыл.
Ты болей мне не снішся па начах.
Зладзей! Пакайся за Гамору!
Не губляй ніколі сябе.

1 ☞працяг

Зубрыная печань і беларускія выбары

ЕС і тым усім, што знаходзіцца за іхняй заходняй мяжой. Краіны ЕС, таксама польскае МЗС, польскі ўрад павінны яшчэ больш падтрымліваць адкрытае грамадства, незалежныя СМІ, а таксама супрацоўнічаць у гаспадарчай сферы, што вельмі важнае, бо можа змяніць свядомасць беларускага грамадства.

Дэпутат Роберт Тышкевіч, лідар падляшскай ГП і віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў ды старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі, у якога мы спыталіся пра ўдзел дэпутата Шчэрбы ў гэтай перадвыбарчай маніфестацыі, заявіў:

— Пан дэпутат Шчэрба прадстаўляў тут толькі сябе самога: не ўрад і не Сейм. У дэпутатаў шырэйшае поле манеўра, чым ва ўрада, і могуць выказваць яны ўласныя меркаванні.

У пятніцу перад выбарамі дэпутат-старшыня, у якога мы спыталіся, ці ён або маршалак Сейма Браніслаў Камароўскі, які ў выбарчую нядзелю прабывае ў Беластоку з нагоды беатыфікацыі ксяндзя Міхала Сапоцькі, склічуць прэс-канферэнцыю, прысвечаную Беларусі, заявіў:

— Да часу абвяшчэння афіцыйных вынікаў выбараў не будзе ад нашага боку ніякіх заяў.

Занадта позна?

У дзень выбараў, у час знаходжання ў Беластоку з нагоды беатыфікацыі кс. Міхала Сапоцькі, прэзідэнт Лех Качынскі, сумняваючыся ў дэмакрытычным іх ходзе, заявіў:

— Выбары з'яўляюцца дэмакратычнымі тады, калі тыя, хто пры ўладзе, не трымаюць над гэтым працэсам кантролю.

Чарговыя дні прынеслі каментарыі палітычных назіральнікаў і еўрапейскіх палітыкаў. Павол Дэмес, шэф бюро Фонду Германа Маршала ў Братыславе, былы шэф МЗС Славакіі сказаў:

— Пасля вызвалення ў жніўні з турмы кіраўніка апазіцыі Аляксандра Казуліна, Еўрасаюз пачаў мякчэць. Выразным доказам таго было некалькі здарэнняў, візіт міністра замежных спраў Радка Сікорскага ці выказванне шэфа еўрасаюзнай дыпламатыі Хав'ера Салоны, якое было амаль пахвальным для Лукашэнкі (...). Выбары, і тое, што адбывалася ў кампаніі, паказалі, што на такую стратэгію было зарана (...). Да гэтай змены націскалі Польшча і Літва, дзве краіны, якія раней выказваліся за цвёрдай лініяй. Цяжка мне зразумець чаму. Некаторыя ў Беларусі сцвярджаюць, што разлічвалі на гаспадарчыя карысці. Я думаю, што Лукашэнка аказаўся быць палітыкам больш спрытным, чым нам здавалася.

Ан-Мары Лізін, віцэ-старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ:

— У выніку, значны прагрэс, на які мы разлічвалі ў дэмакратычным развіцці Беларусі, не атрымаўся.

Бартош Вянглярчык, публіцыст, былы карэспандэнт „Выбарчай газеты" ў Вашынгтоне:

— Аляксандр Лукашэнка рашыў абдурачыць Еўропу. Пасля цярплівых негацыяцый, якія вяліся галоўным чынам, ды не толькі, міністрам Радаславам Сікорскім, пасля яго сустрэчы з шэфам беларускай дыпламатыі, пасля шматлікіх жэстаў, выкананых Еўрасаюзам, Лукашэнка палічыў, што калі не загадаў лупіць дубінкамі людзей на вуліцы, дык гэта значыць, што ўжо з'яўляецца цывілізаваным палітыкам еўрапейскай дзяржавы.

Яцак Пратасевіч, старшыня дэлегацыі Еўрапарламента па справах супрацоўніцтва з Беларуссю:

— Выбары паказваюць, што Беларусі ўсё далёка да дэмакратыі.

Беніта Ферэра-Вальднэр, еўрасаюзная камісар па знешняй палітыцы:

— Цяпер Еўрасаюз павінен задумацца над найлепшым спосабам нашага ангажавання ў кантакты з беларускімі ўладамі і беларускім грамадствам. Тое ангажаванне павінна ўлічваць спосабы павелічэння ўшанавання дэмакратычных прынцыпаў і заховаўвання правоў чалавека, згодна з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі.

Яцак Сарыюш-Вольскі, шэф Камісіі замежных спраў Еўрапарламента (ГП):

— Мы чакалі большага прагрэсу, але не мелі ілюзіі, што выбары будуць поўнасцю дэмакратычнымі. Наступіла аднак нейкае паляпшэнне і заўважылі яе назіральнікі АБСЕ. Але канчатковы вынік выбараў быў усё ж разбуральны. Найперш мусім параіцца з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі. Еўрасаюз павінен трымацца цяпершняй лініі адносін да Мінска.

Радаслаў Сікорскі (30 верасня):

— Неўзабавае сустрэнуся з прадстаўнікамі парламенцкай апазіцыі.

У час пасяджэння сеймавай камісіі замежных спраў 2 кастрычніка віцэ-міністр замежных спраў Анджэй Крэмер прадставіў інфармацыю аб стасунках Польшчы і Беларусі. Міністр Сікорскі разам з жонкай прабываў тады ў Японіі. Тры дні раней у адным з інтэрв'ю віцэ-міністр Крэмер запэўніваў:

— Застаемся ў асцярожным дыялогу з уладамі ў Мінску. Згодна з прадказаннямі, будзе зроблены перагляд санкцый, што не значыць, што яны мусяць быць адразу адменены. Ёсць розныя магчымасці, напрыклад, іх адтэрмінаванне або частковае адтэрмінаванне спалучанае з чарговымі ўмовамі.

Чакаем ад...

Увечары, у дзень пасяджэння сеймавай Камісіі замежных спраў, яе члены выдалі заяву: „Чакаем ад польскага ўрада і ўлад Еўрасаюза ўзмацнення высілкаў дзеля дэмакратызацыі ў Беларусі, а асабліва павелічэння падтрымкі для свабодных медыяў і ўстаноў адкрытага грамадства ў Беларусі. Асабліва істотным лічым стварэнне як найшырэйшых магчымасцей кантактавання грамадзян Беларусі з краінамі ЕС, між іншым, змякчэння візавага рэжыму. Камісія замежных спраў стаіць на пункце погляду, што вяртанне да поўнага палітычнага дыялогу з беларускімі ўладамі павінна быць абумоўлена распачаццем рэжымам у Мінску сур'ёзных размоў з дэмакратычнай апазіцыяй. Толькі ўлічэнне ролі апазіцыі можа паўплываць на распачацце сапраўднага і згоднага з чаканнямі грамадзян Беларусі працэсу рэфармавання дзяржавы, якая дазволіць наладзіць нармальныя еўрапейска-беларускія адносіны, а асабліва ахапіць Беларусь праграмай Усходняга Партнёрства".



Што ні кажыце, але жывем у цікавы для беларускага этнасу час. Звонку падаецца, што няма аніякага такога этнасу, ды і народ такі наўрад ці ёсць, калі глядзець на выкарыстанне ім роднай мовы, на павагу, дакладней, яе адсутнасць, да беларускай гісторыі і культуры. У такіх варунках неангажаваны назіральнік лёгка прыйдзе да высновы, што як Беларусь, так і беларусы ёсць чымсьці штучным, адарваным ад рэальнага жыцця „зразумелых" нацый і народаў, кшталту польскага ці расійскага, літоўскага ці ўкраінскага. Але не ўсё так проста, і знаходзяцца чамусьці нейкія дзіўныя людзі, якія патрапяць распавесці аб спрадвечнай абгрунтаванасці існавання беларусаў. Праўда, дзеля гэтага яны не заўсёды карыстаюцца такім тэрмінам як „Беларусь", а называюць этнічны абшар беларусаў Крывіяй, аб чым і распавядаюць на сайце „Цэнтр этнакасмалогіі «Крыўя»", што месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://kryuja.org.

Варта адразу заўважыць, што сайт сапраўды незвычайны. Прычым не толькі сваім афармленнем, але, натуральна, і зместам. Калі казаць пра знешні яго выгляд, то спачатку ў выяўленні бачыш вельмі мала прыцягальных для вока рэчаў — усё неяк блякла і невыразна. Цікавае пачынаецца потым, калі, напрыклад, выпадкова клікнеш мышкай на выяўленне фотаздымка, што месціцца справа ўверсе. Адразу змяняецца карцінка. Кожны клік нібыта адкрывае новае выяўленне і, здаецца, што гартаеш нейкі фотаальбом, які перадае прыгажосць вядомых з дзяцінства краявідаў.

Такая ж „таямніца" прысутнічае і ў рубрыках „этнакасмалагічнага" сайта. Знайсці іх даволі цяжка. Толькі водзячы мышкай па ўсім выяўленні можна выпадкова адшукаць іх злева ўверсе, схаванымі пад арыйскія піктаграмы.

Наступнай прыемнай нечаканасцю з'яўляецца тое, што рубрык на сайце вельмі многа. Але для першага знаёмства з сайтам варта зазірнуць на старонку „Цэнтр", бо менавіта тут распавядаецца пра тое, чаго ж хочуць гэтыя этнакасмолагі і дзеля чаго стварылі даны сайт.

„Цэнтр створаны як нефармальны кардынацыйны асяродак даследаванняў беларускай даўніны і рэкрэацыі старажытнага светагляду, дахрысціянскай рэлігіі і традыцыйных каштоўнасцяў аўтахтоннага насельніцтва Беларусі (у яе этнаграфічных межах), а таксама балтыйскага рэгіёну", — адказваюць на наша пытанне актывісты Цэнтра. Дарэчы, у адрозненні ад мноства цяперашніх беларускіх сайтаў, тут тыя, хто яго ствараў, не хаваюць сваіх імёнаў і прозвішчаў. Таму з этнакасмолагамі можна пазнаёміцца прайшоўшы ў падрубрыку „Сябры цэнтра".

Наступныя рубрыкі прысвечаны асвятленню ўсяго таго, што нейкім чынам можа тычыцца дахрысціянскай старадаўнасці Беларусі — даследаванні, публікацыі, навуковыя экспедыцыі, фестывалі музыкі, якая, як лічаць некаторыя нашы сучаснікі, гучала на родных абшарах тысячагоддзі таму.

Але навукоўцы цікавяцца не толькі часам мінулым. Свае веды яны прагнуць прымяніць і ў наш час. Відаць, дзеля гэтага на сайце размешчаны артыкулы, якія ёсць нічым іншым, як спробай прыдаць вызнаванаму дахрысціянскаму, гэта значыць паганскаму, кансерватызму сучаснае ідэалагічнае афармленне. Бо, на думку этнакасмолагаў, ён найбольш пасуе да сапраўднага беларускага ладу жыцця.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Зацішны верасень

Як і чакалася, пасля бурлівых падзей пекінскай алімпіяды, верасень выдаўся досыць зацішным. Міжнародных спаборніцтваў праводзілася ў гэтым месяцы няшмат, а ў цэнтры ўвагі быў, як звыкла, футбол — старт адборавай кампаніі да чэмпіянату Еўропы, турнір Лігі чэмпіёнаў. Прыемна, што наш барысаўскі БАТЭ (галоўны трэнер Віктар Ганчарэнка) здолеў вырвацца з ціхага балота і нават у Лізе чэмпіёнаў даў сапраўдны бой масцітаму „Ювентусу" — у Мінску ў змястоўным матчы быў зафіксаваны пачэсны парытэт — 2:2. Пра поспехі мужчынскіх зборных па тэнісе і баскетболе ўжо расказвалася ў адным з нядаўніх нумароў. Жаночай камандай месяца па праве назавем зборную краіны па валейболе (галоўны трэнер Віктар Ганчароў), якая ў стыкавых матчах змагла адолець дружыну Славеніі (3:1 дома і 3:0 у гасцях) і другі раз запар выйсці ў фінальную частку кантынентальнага форуму.

А непрыемным водгуллем алімпійскага жніўня стаў допінгавы скандал, які ўзнік у дачыненні да беларускіх кідальнікаў молата — Вадзіма Дзевятоўскага і Івана Ціхана. У абодвух рэальна могуць забраць алімпійскія ўзнагароды, хоць да канца сітуацыя не прасветлена. Ды і гісторыя гэтая досыць дзіўная — такі „старажытны" допінг (тэстастэрон) ужо даўно ніхто не прымае.

Паколькі спаборніцтваў у мінулым месяцы было не так шмат, вызначыць пяцёркі лепшых на гэты раз было досыць няпроста.

1. Мікалай Казак (батут) на этапе Кубка свету ў партугальскім горадзе Лоул стаў мацнейшым у індывідуальных скачках.

2. Аляксей Фёдараў (шахматы) стаў пераможцам турніру ў сталіцы Румыніі. У Бухарэсце чэмпіён Беларусі набраў 7,5 з 9 магчымых ачкоў.

3. Андрэй Міхневіч (штурханне ядра) зноў стаў трэцім на прадстаўнічым турніры ў Славаччыне, у якім узялі ўдзел усе прызёры алімпіяды.

4. Сяргей Папок (веласпорт) на шматдзённай гонцы „Тур Сочы", якая мае другую катэгорыю, але неўзабаве можа ўвайсці ў больш прэстыжную серыю „Pro Tour", заняў другое месца.

5. Андрэй Каратчэня (тэніс) зрабіў вырашальны ўнёсак у перамогу зборнай Беларусі над камандай Грузіі ў матчы Кубка Дэвіса.

1. Тацяна Пятрэня і **Кацярына Міронава** (батут) на згаданым вышэй этапе Кубка планеты былі абсалютна лепшымі ў сінхронных скачках. А крыху пазней у расійскім Тальяці выйгралі фінал Кубка свету.

2. Вольга Шчэрбачэня і **Тацяна Кухта** (акадэмічнае веславанне) сталі бронзавымі прызёркамі на чэмпіянаце Еўропы ў грэцкім Марафоне ў разрадзе экіпажаў двойкі распашной. Варта дадаць, што аналагічнага поспеху дамаглася наша дзявочая каманда ў лодцы-васьмёрцы.

3. Тацяна Пучак (тэніс) у пары з украінкай Марыяй Карытцавай святкавала вікторыю на турніры ў кітайскім горадзе Гуанчжоу.

4. Надзея Астапчук (штурханне ядра) перамагла ў Маскве на моцным турніры „Выклік Расіі-2008".

5. Аксана Папко (веласпорт) на трэкавым чэмпіянаце Еўропы (U-23), што прайшоў у польскім горадзе Прушкаў, дасягнула бронзы ў гонцы па ачках.

Скончыць падсумаванне верасня хочацца прыемным прызнаннем. Міжнародная федэрацыя лёгкай атлетыкі па выніках сезона назвала лепшымі шматборцамі года амерыканку Хіліс Фантэйн і беларуса Андрэя Краўчанку. Прыгадаем, што наш дзесяціборац сёлета выйграў Кубак Еўропы, стаў сярэбраным прызёрам на алімпіядзе і перамог на топ-турніры ў Францыі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Да 2-й гадавіны смерці Канстанціна Майсені

На палях і будаўнічых пляцоўках

Успамін юрыста Вітальда Ажахоўскага.

З Кастанцінам Майсенем пачаў я кантактавацца ў пачатку 1960-х гадоў, калі стаў на працу юрысконсультам у Павятовым саюзе гмінных кааператываў у Гайнаўцы, старшынёю якога пасля Пятра Кульгаўчыка стаў менавіта ён. Перад прыходам на гэтую пасаду многія мяне папярэджвалі, каб я не звязваў сябе з гэтым „асіным гняздом", бо там амаль выключна працуюць беларусы. Не паслухаў я сваіх дарадчыкаў і ўвогуле не шкадую часу праведзенага ў гэтай установе. Я лічу, што няважна хто якой нацыянальнасці, а тое, каго сабой прадстаўляе.

фота архіў „Нівы"

Канстанцін Майсеня быў сумленным і сціплым чалавекам, якому характэрная была грамадская актыўнасць. Усімі сіламі намагаўся здзейсніць намечаныя планы. Да канца 1968 года, калі быў прымушаны сысці з пасады, у пяці падлеглых яму гмінных кааператывах стварыў вытворча-паслуговыя базы (пякарні, каўбасныя заводы, склады і г.д.). Перанёс сядзібу Павятовага саюза ў новы офіс па вул. Горнай. У час яго знаходжання на пасадзе старшыні на тэрыторыі Гайнаўскага павета былі пабудаваны 104 вясковыя мураваныя крамы. Такім чынам гайнаўская вёска атрымала магчымасць забяспечвацца прадуктовымі і прамысловымі таварамі на месцы, а не ў павятовым ці гмінных цэнтрах.

Нягледзячы на несумненныя дасягненні, Канстанцін Майсеня не карыстаўся падтрымкай тагачасных партыйных павятовых і ваяводскіх улад, якім па невядомых прычынах не падабалася ягоная творчая сіла. Замест узнагарод пазбаўлялі яго прэміяльных, аж урэшце адхілілі ад пасады. Пасля гэтага працаваў ён на другарадных пасадах у кааператывах у Кольне і Беластоку, а ў пачатку 1970-х гадоў уладкаваўся дырэктарам Торфапрадпрыемства „Імшар" каля Міхалова. Я таксама там працаваў — даязджаў на работу два разы ў тыдзень.

Як у Гайнаўцы, так і ў „Імшары", Канстанцін Майсеня праявіў сябе выдатным гаспадарнікам: мадэрнізаваў машынны парк па дабычы і апрацоўцы торфу, здабыў новыя рынкі збыту, дбаў пра інтарэсы працаўнікоў, арганізаваў ім таварыска-адпачынковыя мерапрыемствы. Па гэтай прычыне карыстаўся даверам калектыву. Аднак з-за складанага даезду ў „Імшар" у 1977 г. Майсеня знаходзіць працу бліжэй Гайнаўкі — у Нараўцы, дзе ўзначальвае сельскагаспадарчы кааператыў. І зноў прыйшлося мне з ім працаваць, гэтым разам ягоным намеснікам па арганізацыйна-юрыдычных і сельскагаспадарчых справах. Там таксама праявіў свае кіраўнічыя ўмеласці. У Нараўцы, на акраінах пасёлка, пабудаваў вытворчую базу, збожжавы перагрузачны пункт, рамонтныя майстэрні.

Выязджалі мы ў Нараўку раніцай, а вярталіся ў Гайнаўку познім вечарам. Працавалі мы не толькі ў канторы, але многа часу праводзілі на палях і будаўнічых пляцоўках.

Чарговым этапам у працоўнай кар'еры Майсені быў вельмі занядбаны сельскагаспадарча-вытворчы кааператыў у Бельшчыне. На працягу кароткага часу прыведзены ён быў у належны парадак у арганізацыйным і тэхнічным плане.

Другой, калі не асноўнай, яго жыццёвай стыхіяй была дзейнасць у беларускім грамадска-культурным руху, з якім быў звязаны з 1956 года. Акунуўся ў яе з галавою, калі стаў працаваць у кіраўніцтве Галоўнага праўлення БГКТ. Там таксама прыдаўся ягоны гаспадарніцкі вопыт: аднавіў фасад і правёў рамонт унутры будынка БГКТ у Беластоку па вул. Варшаўскай, 11. Тады таксама стаў ажыццяўляць ідэю стварэння беларускага музея. Збіраў ён прадметы беларускай культуры здаўна з думкай аб будучым музеі. У 1984 г. заснаваў ён камітэт пабудовы музея і кіраваў ім шмат гадоў. Гэта яго намаганнямі быў узведзены і адпаведна аснашчаны беларускі музей у цэнтры Гайнаўкі. Пасля пераходу на пенсію ў 1994 г. не пакінуў займацца музейнымі справамі, працаваў пры іх на грамадскіх пачатках аж да часу, калі хвароба прыкавала яго да шпітальнага ложка.

Я перакананы, што здзейсненае Канстанцінам Майсенем будзе жыць у памяці не толькі яго сучаснікаў, але і наступных пакаленняў.

Запісаў у 2003 г. Віктар Бура

Аб перадачы Беларусі дакументаў роду Радзівілаў

У Пасольстве Беларусі ў Варшаве падчас сустрэчы пасла Беларусі ў Польшчы Паўла Латушкі з прадстаўнікамі роду Радзівілаў у Польшчы Мацеем і Каралем Радзівіламі адбылася цырымонія перадачы двух арыгінальных прыжыццёвых гравюр (XV і XVI стагоддзяў) партрэтаў Януша Радзівіла і Мікалая Радзівіла (набытыя Мацеем Радзівілам на аўкцыёнах у Германіі), лічбавой копіі партрэта Барбары Радзівіл і актуалізаванага генеалагічнага дрэва роду Радзівілаў. Перадаючы гэтыя каштоўныя дакументы нашчадкі Радзівілаў выказалі жаданне ўбачыць іх у адноўленым Радзівілаўскім замку ў Нясвіжы, а таксама выказалі гатоўнасць аказання фінансавай дапамогі ў вырабе якасных лічбавых копій партрэтаў Радзівілаў, якія знаходзяцца ў музеях Варшавы.

Ад імя Пасольства Беларусі паслом была выказана шчырая ўдзячнасць Мацею і Каралю Радзівілам за каштоўныя і неабходныя дакументы для ствараемай музейнай экспазіцыі Радзівілаўскага замка ў Нясвіжы.

Пасольствам падтрымоўваюцца шматгадовыя кантакты з прадстаўнікамі роду Радзівілаў у Польшчы, у тым ліку дыпмісіяй была арганізавана паездка Мацея і Караля Радзівілаў у Рэспубліку Беларусь. Трэба адзначыць, што ў адказ на просьбу Пасольства Мацеем Радзівілам была аказана фінансавая дапамога ў арганізацыі канцэрта ў Варшаве Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча, які выступаў у час інаўгурацыі Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы.

Мацеем Радзівілам таксама ажыццяўляюцца дзелавыя кантакты з Беларуссю. Так, яго фірмай, па выніках праведзенай у Варшаве Нацыянальнай выставы Рэспублікі Беларусь, падпісаны доўгатэрміновы кантракт на пастаўкі шчэбню з Брэсцкай вобласці для рэканструкцыі чыгуначнай лініі Тарэспаль — Бела-Падляшская.

Пры садзейнічанні Пасольства РБ 2-4 кастрычніка 2008 года ў Нясвіжы адбудзецца пасяджэнне групы беларускіх і польскіх экспертаў па пытаннях нясвіжскіх помнікаў з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў культуры Беларусі і Польшчы ды прафесара Анджэя Цехановецкага з Лондана. Сустрэча экспертаў праводзіцца ў адпаведнасці з рашэннем Беларуска-Польскай кансультатыўнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, пасяджэнне якой адбылося ў красавіку 2008 года ў Познані.

Міністэрства культуры Польшчы афіцыйна паінфармавала Пасольства, што ў адпаведнасці са зваротамі дыпмісіі, у сапраўдны час вядзецца праца па падрыхтоўцы лічбавых копій 48 партрэтаў Радзівілаў, якія знаходзяцца ў фондах музеяў у Варшаве, для перадачы ў будучым на экспазіцыю ў Нясвіжы.

Пасольствам таксама прапрацоўваюцца разам з Міністэрствам культуры Польшчы пытанні арганізацыі ў другой палове кастрычніка б.г. на базе Каралеўскага замка, Нацыянальнага музея і Вілянаўскага палацава-замкавага комплексу ў Варшаве стажыроўкі групы беларускіх спецыялістаў, якія займаюцца стварэннем музейнай экспазіцыі ў Нацыянальным гісторыка-культурным запаведніку „Нясвіж".

Прэс-служба Пасольства РБ

Адгаданка

1. жыве на чужы кошт, 2. пасля сакавіка, 3. цвёрды коўкі сплаў жалеза з вугляродам, 4. агульнае цяжкае парушэнне функцый арганізма ў выніку моцнага фізічнага пашкоджання ці псіхічнага ўзрушэння, 5. ніз пасудзіны ці вадаёма, 6. пасля восені, 7. ядавіты грыб з чырвонай або жоўтай шапкай у белыя крапінкі, 8. дзяржаўны абвінаваўца ў судзе.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нідэрландская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 36 нумара

Абоз, авёс, ачаг, веер, гуж, Дума, егер, зачын, Зізаній, Індура, ком, мыла, Уайльд.

Рашэнне: **Разумны чалавек ідзе сваёй дарогай, дурань бегае за чужымі лозунгамі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: I kwartał 26 zł. do 5 grudnia 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego oraz oddziały „Ruch" i „Kolporter" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.
Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 420 egz.

Музей ля дарогі

Яшчэ, здаецца, сцены аддаюць дзіцячыя галасы, якія ўбіралі ў сябе дзесяцігоддзямі. Яшчэ ўчора тут былі гоман, смех, тузаніна, часам слёзы, адным словам — жыццё. Сёння парты, крэслы, дошкі і падлогу ў цёмных калідорах пакрывае тоўсты слой пылу. У коміне завяліся непаседы-галкі, вецер скідае па адной дахоўцы з даху, у шчытавой сцяне абарваліся дзве шалёўкі, чыясьці рука метка шпурнула камень у фортачку акна... Тыповы абразок у беларускай падляшскай вёсцы, са школай у цэнтры, пачатку XXI стагоддзя.

Такі сцэнарый меў поўнае права ажыццявіцца і ў Рыбалах, дзе апошні школьны званок празвінеў у чэрвені 2007 года. Жменьку дзяцей, якая засталася ў навакольных вёсках, сталі вазіць у Заблудаў. Свая школа стала непатрэбнай. На шчасце не ўсім!

Ідэю, што зрабіць з будынкам, каб і надалей служыў народу, хоцькіняхоцькі паддалі настаўнікі, якія ў апошнія гады існавання школы стварылі куточак мясцовай культурна-этнаграфічнай спадчыны. „Трэба сабраць больш экспанатаў, якія яшчэ нядаўна былі неад'емнай часткай вясковага жыцця, а сёння часцяком гніюць-ржавеюць нікому непатрэбныя і стварыць музей колішняга побыту тутэйшых сялян", — да такой высновы прыйшлі настаяцель праваслаўнага прыхода ў Рыбалах а. Рыгор Сасна і дырэктар Вясковага дома культуры Лідзія Мартынюк. На такое прызначэнне былой школы пагадзілася адміністрацыя Заблудаўскакй гміны. Засталося „толькі" задуму пераўтварыць у рэальны быт.

Бацюшка звярнуўся ў царкве да вернікаў з заклікам ахвяраваць музею экспанаты. Прыклад дала сама матушка Антаніна, прынесшы ў былую школу сямейныя скарбы. Лідзія Мартынюк таксама знайшла ў мамчыных сундуках многа цікавай вопраткі, макатак, старога посуду. За імі пайшлі іншыя: Таццяна Шпілеўская з Рыбалаў, Надзея Раманюк з Паўлаў, Зінаіда Добаш... Пералік можна працягваць, але не ў тым рэч. Важна, каб жыхары Рыбал зразумелі, якую вартасць маюць часта несамавітыя, сціплыя прадметы, прызначэнне якіх нам ужо не цалкам вядомае. Колькі, напрыклад, было розных прылад для апрацоўкі лёну! А якія цуды маглі з яго выткаць умелыя жаночыя рукі! Не абысціся было на вёсцы і без каваля, які не толькі падкоўваў коней, але і абслугоўваў шмат іншых сфераў жыцця.

Экспанаты ў рыбалаўскім музеі не ананімныя. Укладальнікі экспазіцыі запісваюць не толькі прозвішчы ахвярадаўцаў, але і тых (калі гэта можна ўстанавіць), каму яны служылі. Маю ўвагу, напрыклад, прыцягнула кашуля маладой — тонкая, далікатная, з фантазійным узорам дзірачак і прарэзаў (хто казаў, што нашым продкам было чужое мастацтва эротыкі!?) — якую ўласнаручна пашыла сабе мама спадарыні Лідзіі.

Гледзячы куток з кухонным посудам, заўважыў я сіфон. Божа мой, што тут робіць цуда тэхніхі часоў майго дзяцінства? На жаль, некалькі дзесяткаў гадоў праляцела і сёння дзецям гэта такі самы музейны экспанат як прас з металічнай плашкай.

З дапамогай такіх прыладаў гаспадыні рыхтавалі ежу

Далікатная, фантазійная начная кашуля маладой

Лідзія Мартынюк тлумачыць рэжысёру Дарыюшу Шадзе-Бажышкоўскаму складанае мастацтва ткацтва

Каб запрэзентаваць гэтае багацце, давялося ўкласці шмат фізічнай працы як па ўпарадкаванні школьных залаў, так і панадворка. Выкарчаваць разрослы без меры бэз, вычысціць зарослы без гаспадара брук. Лідзія Мартынюк асабліва ўдзячная за дапамогу Таццяне Яхімовіч і яе мужу Віталію — рэпатрыянтам з Казахстана, якія знайшлі сваё месца ў Рыбалах ды мясцовай бібліятэкарцы Альжбеце Баніфацюк.

Наколькі патрэбная гэтая ініцыятыва, сведчаць запісы наведвальнікаў у памятнай кнізе. А экскурсій было там ужо сапраўды шмат. Балазе, праз Рыбалы ідзе важная шаша Беласток — Бельск і далей на Люблін. А кожнаму, хто спыніцца ля школы, гаспадары аб'екта ахвотна пакажуць колішняе матэрыяльнае і духоўнае жыццё беларускай вёскі.

Музейная экспазіцыя яшчэ не закончана, ёсць планы яе разбудовы і месца на новыя экспанаты. Выкарыстання чакае добра захаваная традыцыйная печка. На гэта, аднак, патрэбныя зразуменне і дапамога. Перш-наперш гміны, але і большай колькасці жыхароў Рыбалаў. Бо на адным энтузіязме жменькі асоб цяжка далёка заехаць. Шкада іхняга здароўя.

М. В.

Фота Аліны і Міколы ВАЎРАНЮКОЎ

12.10 — 18.10

(22.03. — 20.04.) Энергіі хопіць, але можаш аддаць яе на справы нявартыя захаду. Не будзь запальчывым! Для ворагаў будзеш бязлітасны, для сяброў — хоць ты да раны кладзі. Важны момант у жыцці, грунтоўныя змены, адкінеш тое, да чаго прывык па сантыменце.

(21.04. — 21.05.) Можаш добра ацаніць круцяля і ворага, зрабіць кепскі выбар, хоць з добрай думкай. На працы будзь разважлівы і цярплівы, дачакаешся вынікаў. Нішто не стане табе на дарозе, шмат спраў папхнеш дапераду.

(22.05. — 22.06.) Да 14.10. можа моцна папсавацца ў прафесійным плане ці ў падарожжах. У пачуццёвым жыцці нуднавата; не адбудзецца нічога, чаго ты ўжо не перажыў. Маеш шчасце да людзей, дзякуючы якім далёка зойдзеш.

(23.06. — 23.07.) Будзеш больш радасны, прыхільны да іншых, адразу паявяцца ніці сімпатыі з незнаёмымі, асабліва з Быкамі. Да 13.10. пазбягай афармлянння важных фінансавых спраў, пільнуй кашалька. Пры поўні Месяца можа быць шмат цяжкіх і выматваючых з сілы сітуацый; трымай нервы ў руках і не паддайся на правакацыю на працы.

(24.07. — 23.08.) 12-16.10. знакамітая інтуіцыя, якая падкажа табе найлепшыя выхады, не дасць нарабіць памылак; творчыя ідэі. Не пераймайся зласлівымі заўвагамі. Не марнуй таксама энергіі на тлумачэнні простых спраў.

(24.08. — 23.09.) Усе справы рушаць з месца ў кар'ер, надгоніш усё прапушчанае. Будзеш мець шырокае поле для паказання таго, што можаш, а калі цябе спыняць, у нічым гэта табе не перашкодзіць. Вельмі моцна зацікавіцца табою новапазнаная асоба.

(24.09. — 23.10.) Да 13.10. пільнуйся, каб цябе не ашукалі. Пры поўні Месяца рыхтуюцца непрыемныя сутычкі з супрацоўнікамі; могуць цябе фальшыва абвінаваціць. Рамантычныя парывы сэрца, хоць у пастаянных парах спрэчкі з партнёрам, які захоча ўвесці нейкія змены.

(24.10. — 22.11.) Вялікая адвага, а нават геройства. Зможаш справіцца з вялікімі мерапрыемствамі, да якіх трэба добра прыкласціся, але прынясуць яны вялікія поспехі. Самотны Скарпіён без праблем знойдзе сабе файную пару, асабліва ў гарачыя дні да 12.10.

(23.11. — 22.12.) Зблізіць цябе і партнёра супольнае захапленне або перашкода, з якой разам справіцеся. Пачнецца новы раздзел у пачуццях; калі трэба, забудзеш аб былым, якое прынесла табе шмат жалю. Дасі рады з кожнай чыноўніцкай справай. На фінансы таксама няма што наракаць!

(23.12. — 20.01.) Да 13.10. нечаканыя матэрыяльныя клопаты. На галаву звалiцца многа спраў, што можа стаміць; рабі тое, што найважнейшае. Самотны Казярог можа акунуцца ў новае каханне, якое не мусіць быць узаемным. Можаш вярнуцца да старых планаў.

(21.01. — 19.02.) Да 14.10. пільнуй ладоў у сям'і, асабліва з малодшымі. Добра ў прафесійным развоі, магчымы хуткі поспех, калі будзеш працаваць і сам, і ў калектыве (для амбітных Вадалеяў гэта адзін з самых лепшых месяцаў!). У пачуццях ты — пан сітуацыі!

(20.02. — 21.03.) 12-16.10. спадарожнічаць табе будуць незвычайныя спакой і сіла, вялікая інтуіцыя; сны могуць аказацца прарочымі. Можаш выйграць у латарэі або паехаць у замежжа. Не спрачайся з кіраўнікамі; дагаварыцца можаш з імі пасля 18.10.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960